Родитель. Это опыт наших предков, испытанный временем, если бы не было от него пользы, так он не передавался бы из поколения в поколение. То, что по-настоящему ценно, будет актуально в любое время. Считаю, что в фольклоре много доброты, материнского тепла, заботы.

Педагог. Откуда вы берёте фольклорные произведения?

Родитель. Повторюсь, это воспоминания из моего детства, теперь моя мама — живой источник колыбельных, пестушек для Алинки. Ну и, конечно же, детские книжки.

Педагог. Обращали ли вы внимание, как реагирует ребёнок на колыбельные?

Родитель. Она успокаивается, смотрит в глаза, прислушивается к голосу. И мой голос становится мягче, интонация ласковая, напевная.

Педагог. Как вы думаете, что чувствует ваша малышка при этом?

Родитель. Наверное, чувствует интерес и что о ней заботятся, её любят.

Педагог. А что чаще всего становится причиной использования фольклора?

Родитель. Утром взгляну на дочку, начинаю с ней разговаривать, тут и придёт на ум потешка. Начнём умываться, тоже потешку расскажу или когда раскапризничается.

Педагог. Как вы думаете, использование фольклора помогает только когда надо, например, ребёнка успокоить, уложить спать, или его ценность глубже?

Родитель. Я думаю, главная ценность фольклора в том, что он воспитывает. Это источник добрых, умных мыслей. Уверена, что ребёнок, которому в детстве мама пела колыбельные, рассказывала прибаутки, пестушки, потешки, вырастет более уверенным человеком, ведь он испытал настоящую материнскую любовь, а значит, испытает и потребность дарить эту любовь другим людям, своим детям.

ЧАСТЬ 2. «ИГРОВОЕ ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ С РЕБЁНКОМ».

(15—20 минут.)

Педагог. Давайте подойдём к Алинке, пообщаемся с ней. *(Педагог вместе с мамой подходит к ребёнку.)*

— Кто-кто в этой комнате живёт?

— Кто-кто вместе с солнышком встаёт?

Мама отвечает:

— Это Алиночка проснулась,
С боку на бок повернулась
И, откинув одеяло,
Вдруг сама на ножки встала.

Педагог. А что Алина утром делает? *(Умывается.)* Где наша водичка? *(Мама помогает дочке умыться.)*

Водичка-водичка,
Умой наше личико,
Чтобы глазки блестели,
Чтобы щёчки краснели,
Чтоб смеялся роток,
Чтоб кусался зубок.

Во время умывания мама обращается к малышу, проговаривая свойства воды: прозрачная, течёт, льётся, журчит и т.п. Далее разыгрывается ситуация с куклой: её умывают над игрушечным тазиком. В конце мама с Алиной поливают куклу из кувшина, вытирают её полотенцем.

Педагог. Замечали ли вы разницу в проведении всех этих режимных моментов с использованием и без использования фольклора?

Родитель. Когда проговариваешь ребёнку потешку, то вовлекаешь его в некую игру. Алина прислушивается, иногда прямо следит за губами, а если ещё игрушку возьмёшь, вообще не будет предела её радости.

Педагог. Спасибо, было интересно, возьмите в подарок брошюру. Мы уверены, что используя фольклорные произведения во взаимодействии с ребёнком, вы сделаете ваше общение более доверительным и ласковым. До новых встреч!

ПРИМЕРНАЯ ТЕМАТИКА консультаций для родителей, воспитывающих детей в возрасте от рождения до трёх лет

1. «Родители и дети».
2. «Родительская любовь».
3. «Как воспитать ребёнка и получить удовольствие. Подводные камни воспитания».
4. «Фольклорная педагогика: пестушки и потешки для малышей».
5. «Экология и безопасность детского счастья».
6. «Профилактика задержки речевого развития».
7. «Ребятам о зверятах, или Знакомство малыша с животными».
8. «Ай да наши пальчики: развитие мелкой моторики рук».
9. «Раннее развитие музыкальных способностей».
10. «Кризис трёх лет».
11. «Бабушка и дедушка в жизни малыша».
12. «Детские болезни».
13. «В постель с бутылочкой».
14. «Дневной сон».
15. «Единственный ребёнок в семье».
16. «Игрушки в познавательном развитии ребёнка».
17. «Как научить ребёнка пользоваться туалетом».
18. «Детские капризы».
19. «Адаптация ребёнка к детскому саду».
20. «Избалованные дети».

ТВОРЧЕСКИЕ МАСТЕРСКИЕ ДЛЯ РОДИТЕЛЕЙ, ВОСПИТЫВАЮЩИХ ДЕТЕЙ ОТ РОЖДЕНИЯ ДО ТРЁХ ЛЕТ

Тема: «УДИВИТЕЛЬНЫЙ И ВОЛШЕБНЫЙ МИР ТЕСТОПЛАСТИКИ».

Цель: оказать практическую помощь родителям в организации изобразительной деятельности (тестопластики) детей в семье, помочь реализации педагогического потенциала семьи в развитии интереса ребёнка к художественному творчеству.

Материал: солёное тесто, клеёнка, стеки, краски (гуашь), бросовый и подручный материал (спички, проволока, зубочистки, расчёска, чесночница и т.д.).

Место проведения: семейная комната.

Продолжительность: 1 час 30 минут.

Количество участников: 20 родителей.

Ход мероприятия

I. Информационный блок — 25 минут.

Особый интерес при осуществлении развивающей работы с детьми данного возраста представляет тестопластика. Её цель — гармонизация личности ребёнка через развитие способностей самовыражения и самопознания в искусстве. Тестопластика полезна, она не

имеет противопоказаний, незаменима для предупреждения тяжёлых эмоциональных нарушений, несформированности коммуникативной компетентности, а также для развития игровой деятельности, формирования у ребёнка игровых мотивов и интереса к игре.

Солёное тесто имеет много преимуществ перед другими пластическими материалами:

- его можно приготовить в любой момент, не тратя много денег;
- легко отмывается и не оставляет следов;
- безопасно при попадании в рот (обычно, один раз попробовав тесто на вкус, ребёнок больше не пытается взять его в рот, поскольку оно невкусное);
- если оно правильно замешено, то лепится замечательно, к рукам не пристаёт;
- можно сушить в духовке, а можно и на воздухе;
- возможности для росписи практически неограниченные;
- поверх краски хорошо покрывать лаком — сохранится на века;
- с готовыми поделками можно играть без боязни, они не потеряют форму.

Занятия тестопластикой не только помогают развивать мышление, глазомер, пространственное восприятие, тактильные ощущения, но и открывают детям прекрасный мир искусства, многовековые представления о красоте и гармонии.

Не следует забывать и о её лечебном эффекте: исчезают нервозность, возбуждённость, концентрируется внимание, улучшается память, повышается обучаемость. Очень важной специфической чертой тестопластики является её тесная связь с игрой. Объёмность выполненной фигурки стимулирует к игровым действиям с ней, малыши начинают играть со своими поделками сразу же.

ТЕСТО. КАК С НИМ РАБОТАТЬ

Существует множество рецептов теста для лепки. Но в зависимости от качества муки, от того, что задумано, вы можете сами варьировать ингредиенты и их пропорции, добиваясь нужного результата опытным путём. Приведём несколько рецептов, которых, вероятно, окажется вполне достаточно для работы, особенно на первых порах.

Мука должна быть белой, достаточно высокого качества. Соль требуется мелкая. *Основной рецепт очень прост: соли и муки должно быть поровну, воду, постоянно перемешивая тесто, добавляют в количестве немного большем половинного количества муки и соли.* Количество воды может изменяться в зависимости от качества муки. Тесто разминают руками, поэтому на ощупь легко определить, насколько оно пластично и готово к лепке.

Если вы хотите сделать изделие максимально прочным, вместе с водой добавьте канцелярский клей или ПВА. Если вы замесили теста больше, чем вам необходимо для конкретного изделия, положите остаток в полиэтиленовый пакет или заверните в фольгу. Для длительного (в течение нескольких дней) хранения тесто лучше положить в холодильник (в отделение для овощей) или просто в прохладное место. Остатки сухого, но невыпеченного теста можно использовать повторно, предварительно размельчив и смешав с водой до нужной густоты.

Работать с тестом надо на гладкой, легко моющейся поверхности. Вылепленные фигурки можно оставить перед запеканием сохнуть на воздухе, а можно сразу поместить в духовку.

Иногда в процессе запекания на изделиях образуются трещины или даже отламываются небольшие фрагменты. Фигурку можно спасти, замазав или склеив обломки жидким тестом (обычное солёное тесто, в которое добавляют воду, доводя до консистенции жидкой сметаны). Пригодится такое тесто и для прикрепления деталей к уже высохшей основе.

Цветное тесто можно получить двумя способами. Первый: вместо воды добавить раствор красителя. Можно развести гуашевую краску. Другой вариант: смешивать два или несколько кусков уже окрашенного теста.

ВЫСУШИВАНИЕ ГОТОВЫХ ИЗДЕЛИЙ

Готовые фигурки можно высушивать несколькими способами. Первый и самый простой — сушка на воздухе. Правда, при таком способе лучше немного изменить рецепт теста для увеличения прочности изделия. Вместо воды в данном случае к муке и соли добавляют мучной или крахмальный клейстер или клей ПВА.

Второй способ — сушка в духовом шкафу. В духовке изделие нужно сушить от получаса до двух часов, в зависимости от его размера. Нельзя ставить поделку в разогретую духовку, так как это может привести к растрескиванию. Изделия раскладывают на противне до того, как духовка будет нагреваться. Огонь должен быть маленьким, дверца приоткрыта. Высушивание фигурок в духовке электрической плиты проходит немного иначе. Процесс длится около трёх часов при минимальной температуре. Микроволновая печь совершенно не подходит для высушивания изделий из теста.

ИНСТРУМЕНТЫ, ПРИСПОСОБЛЕНИЯ И ДОПОЛНИТЕЛЬНЫЕ МАТЕРИАЛЫ

Для работы с солёным тестом понадобятся самые разнообразные вещи, большая часть которых у вас уже есть. Для изготовления плоских изделий нужны скалка, линейка, фольга или ткань, нож-резак, стеки из коробки с детским пластилином, трубочка от упаковки с соком (ею очень удобно делать отверстия для подвешивания фигурки). Формочки для выпечки, различные крышки, колпачки от маркеров и ручек, коробочки, спички, чесночница, ситечки, проволока, расчёска и т.д.

Внимательно посмотрите на различные мелочи в вашем доме. Они вам помогут и пригодятся. Для раскрашивания используются краски двух видов: акварельные и гуашь (темпера, акрил). Акварель применяют для росписи, требующей переходов и просвечивания основы, гуашь хороша там, где нужны яркие, декоративные цвета. Для лакировки применяют нитроцеллюлозный лак. Лакируют на открытом воздухе или в хорошо проветриваемом помещении.

II. Кофе-пауза «Сластёна» — 15 минут.

III. Практический блок — 40 минут.

Родителям предлагается практически поработать с тестом, слепить задуманное изделие — любимую игрушку, сказочного персонажа либо что-то другое, представленное и задуманное самим родителем.

ПРЕЗЕНТАЦИЯ БУКЛЕТОВ И ПАМЯТОК ДЛЯ РОДИТЕЛЕЙ

Родителям предлагаются буклеты и памятки с теоретическим материалом: информация о значении тестопластики, о работе с тестом, а также технологические карты поделок, дополненные иллюстрациями, которые родители могут слепить совместно с детьми в домашних условиях.

ДОМАШНЕЕ ЗАДАНИЕ

Родителям предлагается дома разукрасить изготовленные ими в детском саду поделки и совместно с ребёнком слепить любимую игрушку, разукрасить её с целью организации выставки совместного творчества.

IV. Рефлексия — 10 минут.

Родителям предлагается ответить на ряд вопросов:

1. Что вам понравилось в нашей творческой мастерской?
2. Какие трудности у вас возникали в процессе? Почему?
3. Что вы испытываете сейчас? Опишите своё эмоциональное состояние.

Тема: «КАК ПОДРУЖИТЬ МАЛЫША С КНИЖКОЙ».

Цель: уточнить представления родителей о значении книг для детей раннего возраста, познакомить с приёмами «вовлечения» малыша в мир книг; помочь реализовать педагогический потенциал семьи в развитии интереса ребёнка к художественно-речевой деятельности.

Материал: фотографии детей, посещающих материнскую школу и их любимые книжки (приготовленные родителями заранее), тесьма или верёвочки 30—40 см по количеству участников, пластилин, акварельные краски, фломастеры, клей, скотч, ножницы, природный и бросовый материал, разные виды бумаги, сундучок и куклы сказочных персонажей, картинки и изображения животных, игрушек, предметов, знакомых малышу (посуда, одежда и т.д.).

Место проведения: семейная комната.

Продолжительность: 1 час 30 минут.

Количество участников: 20 родителей.

Ход мероприятия

I. Информационный блок — 25 минут.

Подумать о том, как подружить ребёнка с книгой, стоит уже тогда, когда он только появился на свет. Когда мама ласковым голосом эмоционально передаёт содержание песенок, потешек, коротких сказок своему крохе, формируется его слуховое восприятие, он сосредоточивается на звуках языка и мелодике речи. А это не что иное, как основа для восприятия речи, в том числе и книжной. У двухлетних детей уже есть свои любимые сказки, которые они просят рассказать снова и снова. Они быстро запоминают текст и всё больше интересуются картинками. (Родители делятся семейным опытом, совместно с педагогом обсуждают предложенные варианты.)

II. Кофе-пауза «Сластёна» — 15 минут.

III. Практический блок — 40 минут.

Игра **«Вовлечение в сказку».**

Ведущий предлагает мамам взять фото своего малыша, которое они принесли заранее, и вырезать его по контуру. Затем взять любимую книгу ребёнка, из верёвочки (тесёмки) сделать петлю и прикрепить её узлом к книге. С помощью скотча или клея прикрепить фото малыша к другому концу верёвочки. Получилась своеобразная закладка.

Ведущий (В.). Теперь ваш ребёнок может попасть на любую страничку книги, чтобы стать непосредственным участником событий. В сказке он будет чувствовать себя раскрепощённо, получать удовольствие от игры, соотносить сказку с собой.

Предлагаем вам познакомить малыша и с книжкой-игрушкой. Её можно изготовить из различного материала — клеёнки, пластилина, ворсистых и гладких тканей *(показывает возможные образцы)*. Разнообразная фактура материала прекрасно развивает тактильные ощущения малыша, мелкую моторику руки. Перелистывая страницы книжки, познакомьте малыша с названиями животных и окружающих его предметов.

Упражнение **«Книжка-игрушка своими руками».**

Ведущий предлагает мамам изготовить книжку-игрушку из различных материалов, полузаготовок.

Упражнение **«Презентация книжки-игрушки».**

Мамам и папам предлагается поочерёдно рассказать о своей книжке, сформулировать её воспитательное и развивающее значение.

Релаксационное упражнение **«Путь в сказку».**

Ведущий предлагает родителям отправиться в прекрасную сказку далёкого детства: «Закройте глаза... представьте, что вокруг летают бабочки, стрекозы. Жужжат пчёлы — они собирают мёд. Поют птицы, пахнет цветами, земляникой... и вот на холме вы видите прекрасный дворец. Вы идёте по дороге, ведущей к дворцу. Войдя, вы поражаетесь его красоте. Всё здесь удобно и красиво, как будто кто-то строил этот дворец специально для вас. И вы понимаете, что найдёте здесь что-то очень важное для себя. Вы идёте по залам своей лёгкой уверенной походкой. И, наконец, находите то, что хотите... Всё хорошее вы возьмёте с собой. А сейчас вы делаете глубокий вдох и выдох. Возьмите с собой всё хорошее, что было с вами в путешествии, и потихоньку, открывая глаза, возвращайтесь ко мне».

Рефлексия.

В. Расскажите, как вы себя чувствуете. Может, кто-то поделится, что взял с собой из прекрасного дворца? *(Участники обмениваются впечатлениями.)*

Домашнее задание.

Родителям предлагается дома изготовить книжки «Любимые сказки ... (имя ребёнка)» для выставки совместного творчества.

IV. Рефлексия — 10 минут.

Родителям необходимо ответить на ряд вопросов:

1. Что вам понравилось в нашей творческой мастерской?
2. Какие трудности у вас возникали в процессе? Почему?
3. Что вы испытываете сейчас? Опишите своё эмоциональное состояние.

ЛИТЕРАТУРА:

Белобрыкина, О.А. Волшебный мир домашнего театра. — М., 1999.

Гиппенрейтер, Ю. Общаться с ребёнком. Как? — М.: АСТ; Астрель, 2007.

Горькова, Л.Н. Праздники и развлечения в детском саду / Л.Н. Горькова, Л.А. Обухова, А.С. Петелин. — М., 2004.

Дружная семейка: гармонизация детско-родительских отношений в условиях дошкольного учреждения / сост. И.В. Волобуева. — Мозырь: ООО ИД «Белый Ветер», 2006.

Жихар, О.П. Планирование и организация работы в группах раннего возраста «Малыши» / О.П. Жихар, З.В. Кощева. — Минск: Зорны верасень, 2006.

Зарецкая, Н.В. Календарные музыкальные праздники для детей младшего дошкольного возраста. — М.: Айрисдидактика, 2005.

Катляр, З.Н. Мой тёплый дом. — Часть 1, 2. — Мозырь: ООО ИД «Белый Ветер», 2002.

Косенюк, Р.Р. Педагогическая поддержка родителей / Р.Р. Косенюк. — Минск: Детский Фонд ООН (ЮНИСЕФ), 2008.

Косенюк, Р.Р. Путь к материнству / Р.Р. Косенюк. — Минск: Детский Фонд ООН (ЮНИСЕФ), 2004.

Косенюк, Р.Р. Уметь любить ребёнка / Р.Р. Косенюк. — Минск: Детский Фонд ООН (ЮНИСЕФ), 2004.

Косенюк, Р.Р. Фольклорные произведения, колыбельные песни, игры для младенцев / Р.Р. Косенюк. — Минск: Детский Фонд ООН (ЮНИСЕФ), 2006.

Новиковская, О.А. Весёлые пальчиковые игры. Ум на кончиках пальцев. — М., 2007.

Петрова, Т.И. Игры и занятия по развитию речи дошкольников. — М., 2004.

Пралеска: программа дошкольного образования / Е.А. Панько [и др.]. — Минск: НИО; Аверсэв, 2007.

Сорокина, Н.Ф. Играем в кукольный театр. — М., 2002.

Степаненкова, З.И. Игры для самых маленьких. — Минск: Зорны верасень, 2006.

ОТ РЕДАКЦИИ ЖУРНАЛА «ПРАЛЕСКА».

Уважаемые коллеги, материнская школа — сравнительно новая форма организации работы с родителями в нашей республике. И поэтому мы стараемся первые наработки из опыта её деятельности полнее донести вам, практикам. О том, как умело используют материнскую школу в яслях-саду № 242 г.Минска рассказывалось в нашем журнале в № 8 за 2007 год. В последующих номерах «Пралескі» будет продолжена публикация материалов из опыта данного дошкольного учреждения, в частности, работы с семьёй конкретных специалистов ДУ. Следите за нашим изданием!

Беларуская мова: НОВАЯ РЭДАКЦЫЯ ПРАВАПІСУ

Заняткі вядзе загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі БДУ, доктар філалагічных навук, прафесар Віктар ІЎЧАНКАЎ

ПРАВІЛЫ СУЧАСНАЙ АРФАГРАФІІ І ПУНКТУАЦЫІ ТЛУМАЧЫЦЬ СПЕЦЫЯЛІСТ

(Працяг. Пачатак у № 11, 12 за 2009 год і ў № 1, 2, 3 за 2010 год.)

Заняткі дзевятнаццатыя. ПРАВАПІС ГРАФІЧНЫХ СКАРАЧЭННЯЎ

Уводзіны. Ад літарных абрэвіятур трэба адрозніваць графічныя скарачэнні. Яны ўяўляюць сабой даволі спецыфічны факт пісьма, бо не з'яўляюцца самастойнымі словамі, пры чытанні замяняюцца тымі словамі, скарачэннямі якіх з'яўляюцца. Пры вымаўленні чытаюцца поўнасцю.

Тыпы графічных скарачэнняў: умоўныя і агульнапрынятыя. Графічныя скарачэнні бываюць ***умоўнымі.*** Яны сустракаюцца ў спецыяльнай літаратуры, напрыклад, у слоўніках, даведніках. Становяцца зразумелымі пры наяўнасці спісу скарачэнняў у выданні. Так, у «Арфаграфічным слоўніку» М.П. Лобана і М.Р. Судніка пададзена звыш за 40 «прынятых у слоўніку скарачэнняў», у склад якіх уваходзяць спецыяльныя (пазначэнне тэрмінаў: *ав.* — авіцыйны, *анат.* — анатамічны, *бат.* — батанічны, *гандл.* — гандлёвы і інш.; даюцца лінгвістычныя характарыстыкі: *адз.* — адзіночны лік, *выкл.* — выклічнік, *дап.* — дапаўненне, *заг.* — загадны лад і інш.) і агульнапрынятае (*і пад.*). Такія скарачэнні з'яўляюцца для таго, каб не паўтараць словы цалкам шмат разоў. Яны дапускаюцца ў спецыяльных выданнях, але павінны адпавядаць правілам, пра якія гаворка пойдзе крыху ніжэй.

Агульнапрынятыя графічныя скарачэнні маюць іншую прыроду. Яны могуць узнікаць у любым тэксце, у тым ліку і ў рукапісным. Такія скарачэнні павінны абазначаць агульнавядомыя словы. Звычайна не патрабуюць спецыяльных тлумачэнняў, могуць прымяняцца ў любых выданнях, за выключэннем тых, якія разлічаны на чытача-пачаткоўца. Аднак усе яны павінны падлягаць нормам.

У новай рэдакцыі «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» падаюцца агульныя патрабаванні да скарачэння слоў і прыводзіцца пералік найбольш ужывальных, агульнавядомых графічных скарачэнняў.

Скарачэнне слоў рэгламентуецца наступнымі правіламі:

нельга скарачаць на галосную літару, на *ь*, на *й* і на *ў;*

пры спалучэнні дзвюх аднолькавых зычных ***скарачэнне робіцца*** пасля першай зычнай: *насен. фонд;*

пры збегу дзвюх або некалькіх зычных ***скарачэнне робіцца*** на апошнюю зычную: *народн. творчасць.*

Як бачым, прыводзяцца даволі агульныя патрабаванні да скарачэнняў. У любым даведніку ці слоўніку, спецыяльнай літаратуры могуць з'явіцца скарачэнні слоў, што часта паўтараюцца ў выданні, але толькі ў адпаведнасці з адзначанымі вышэй правіламі. Паводле іх павінны фарміравацца і агульнапрынятыя скарачэнні. Гэтыя нормы былі замацаваны «Правіламі» (1959).

Увага! У новай рэдакцыі з'явілася яшчэ адно прадпісанне: калі імя або імя па бацьку пачынаецца з дыграфа *Дз*, то ініцыялам выступае толькі літара *Д: Дзмітрый Дзмітрыевіч — Д.Д.* Напісанне літары *Д.* датычыць таксама і гукавых, ці ініцыяльных *(ДЭК),* і літарных *(СНД)* абрэвіятур. Справа ў тым, што *дз* і *дж* з'яўляюцца дыграфамі (спалучэннямі дзвюх літар), якія абазначаюць адпаведныя гукі. Па аналогіі рэкамендуецца скарачаць імёны тыпу *Джэк, Джон, Джонатан* ініцыялам *Д.*: *Д. Лондан, Д. Апдайк, Д.Свіфт.*

Пры графічных скарачэннях ставіцца кропка і захоўваюцца тыя ж знакі і пачатковыя літары, якія ўласцівы поўнаму напісанню: *В.-Д. к. (Волга-Данскі канал), с.-д. партыя (сацыял-дэмакратычная партыя), чл.-кар. (член-карэспандэнт).*

Стандартныя скарочаныя абазначэнні метрычных мер пішуцца без кропак: *га (гектар), см (сантыметр), кг (кілаграм), км (кіламетр)* і інш.

Ніжэй прыводзяцца агульнапрынятыя скарачэнні, якія не патрабуюць спецыяльнага тлумачэння.

Напрыклад:

акад. — *акадэмік* (пры прозвішчы);
б. — *былы;*
бухг. — *бухгалтэрыя;*
в. — *вёска* (пры назве);
в.а. — *выконваючы абавязкі;*
в-аў — *востраў* (пры назве);
вобл. — *вобласць* (пры назве);
воз. — *возера* (пры назве);
г. — *год* (пры абазначэнні лічбамі);
г. — *горад* (пры назве);
гг. — *гады* (пры абазначэнні лічбамі);
г.зн. — *гэта значыць* (пасля пералічэння);
гл. — *глядзі* (пры спасылках);
гр. — *грамадзянін* (пры прозвішчы);
дац. — *дацэнт* (пры прозвішчы);
заг. — *загадчык* (пры ўказанні *чаго?– аддзела, часткі, кафедры,* а не (!) *аддзелам, часткай, кафедрай*);
зб. — *зборнік* (пры ўказанні *чаго? — навуковых прац, афіцыйных матэрыялаў*);

і г.д. — і гэтак далей (пасля пералічэння);
і да т.п. — і да таго падобнае (пасля пералічэння);
і інш. — і іншае (пасля пералічэння);
і пад. — і падобнае (пасля пералічэння);
нам. — намеснік (пры ўказанні пасады);
напр. — напрыклад (пры спасылках);
н.ст. — новы стыль;
н.э. — наша эра;
параўн. — параўнай (пры спасылках);
п-аў — паўвостраў (пры назве);
праф. — прафесар (пры прозвішчы);
р. — рака (пры назве);
р-н — раён (пры назве);
руб. — рубель (пасля лічбы);
с. — старонка (пры спасылках);
с.-г. — сельскагаспадарчы;
сс. — старонкі (пры спасылках);
с/с — сельскі савет (пры назве);
сп. — спадар (перад прозвішчам);
ст. — стагоддзе (пасля пералічэння);
стст. — стагоддзі (пасля пералічэння);
ст.ст. — стары стыль;
т. — том (пры спасылках перад ці пасля лічбы);
тав. — таварыш (перад прозвішчам);
т-ва — таварыства;
т.зв. — так званы;
тт. — тамы (пры спасылках перад ці пасля лічбы).

У адрозненне ад «Правіл» (1959) у новай рэдакцыі графічныя скарачэнні для большай зручнасці пры пошуку іх у пераліку падаюцца ў алфавітным парадку. Заўважым, што пры скарачэннях множнага ліку *(тамы — тт., гады — гг., стагоддзі — стст.)* кропка ставіцца адзін раз.

Увага! Не дзеляцца пры пераносе абрэвіятуры, якія пішуцца вялікімі літарамі або з'яўляюцца спалучэннем літар і лічбаў, а таксама графічныя скарачэнні слоў і выразаў: *ААН, ЮНЕСКА, НАТА, АБСЕ, ДАІ, АІ-95, г.д., г.зн., стст.;* не адрываюцца пры пераносе ад лічбаў далучаныя да іх злучком канчаткі або часткі канчаткаў: *а 19-й (гадзіне), 1-га (студзеня);* ***не адрываюцца ад прозвішчаў ініцыялы:*** *Я. Брыль, К.М. Міцкевіч, Я.Ф. Карскі, Гурскі М.І.;* пры пераносе нельга адрываць ад лічбы скарочаныя назвы адзінак вымярэння: *1990 г., XXI ст., 100 кг, 50 га, 2 км, 10 см, 1000 руб.*

У наш час з'явіліся новыя графічныя скарачэнні, якія распаўсюджаны ў кароткіх мабільных паведамленнях (sms) і інтэрнэт-маўленні. Звычайна гэта варварыстычныя графічныя скарачэнні іншамоўных выслоўяў. Іх налічваецца шмат. Напрыклад, *add — адрас, aml — усё маё каханне, atb — усяго добрага, aka* — таксама вядомы як *ru ok? — з табой усё добра?* і дзясяткі іншых. Для аператыўнага маўлення гэта натуральная з'ява, але яна мае даволі спецыфічны характар. Да яе трэба ставіцца як да часовага праяўлення інфармацыйна-тэхналагічнага выбуху, пакуль не будуць знойдзены яшчэ больш зручныя спосабы кантактавання...

Актуальнае пытанне. Як правільна аформіць: *у пачатку XIX — сярэдзіне XX* ***ст.*** ці *у пачатку XIX — сярэдзіне XX* ***стст.****?*

Значная колькасць даведнікаў і партал gramata.ru рэкамендуюць выкарыстоўваць формулу *ў пачатку XIX — сярэдзіне XX* ***ст.*** Аднак у гэтым выпадку называецца не адно стагоддзе, а два. Дарэчы, і названы партал непаслядоўны ў сваіх рэкамендацыях. Напрыклад, у адказе на пытанне № 254876 чытаем: «...время возникновения поговорки — конец XVII — первая половина XIX вв.», а ў адказе на пытанне № 208231 знаходзім: «Правильно: 4 — первая половина 5 в.» Арфаграфічна карэктным трэба прызнаць напісанне: *у пачатку XIX — сярэдзіне XX* ***стст.***

Заняткі дваццатыя. ПРАВАПІС ПРЫСТАВАК

Уводзіны. У новай рэдакцыі «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» замест раздзелаў 9—13 «Правіл» (1959) уведзена глава пятая «Правапіс некаторых марфем». У названых раздзелах ішла гаворка пра напісанне галосных у суфіксах назоўнікаў, прыметнікаў і дзеепрыметнікаў, дзеясловаў, у канчатках назоўнікаў, прыметнікаў і займеннікаў, лічэбнікаў, асабовых дзеясловаў. Нават гэты пералік паказвае, наколькі няпростым быў шлях да адказу на пытанне, як напісаць тое ці іншае слова. Напрыклад, *абаперціся* ці *абперціся, даследаванне* ці *даследванне*. Правапіс прыставак і суфіксаў, канчаткаў у «Правілах» (1959) быў размеркаваны па часцінах мовы: для таго каб даведацца, як трэба пісаць слова, трэба было вызначыць прыналежнасць яго да канкрэтнай часціны мовы.

Чаму ў новай рэдакцыі «Правіл» не гаворыцца пра правапіс канчаткаў. У новай рэдакцыі напісанне прыставак і суфіксаў падаецца асобнымі параграфамі незалежна ад таго, да якой часціны мовы адносіцца слова. У «Правілах» (2008) не гаворыцца пра напісанне канчаткаў. І гэта невыпадкова.

Канчаткі ўяўляюць сабой граматычны сродак спалучэння слоў. Родная мова, як усе славянскія, акрамя балгарскай, адносіцца да флектыўных, у якіх слова-спалучальнасць забяспечваецца перш за ўсё флексіяй (канчаткам). У аглютынатыўных мовах дамінуе так званае «прыклейванне» розных суфіксаў і прэфіксаў, прычым кожны з іх мае адно значэнне, важную ролю адыгрываюць артыклі, прыназоўнікі. Такім чынам, канчатак — гэта сродак словазмянення, што адносіць яго да граматыкі. Правапіс канчаткаў рэгламентуецца граматыкай. У ёй вызначаюцца канкрэтныя выпадкі напісання канчаткаў. Напрыклад, у залежнасці ад значэння слова *дуб* у родным склоне можа мець канчатак *-а* ці *-у: падышоў да дуба* (канкрэтнае дрэва) *і ўзяў дубу на калодзеж* (будаўнічы матэрыял). Лексіка-граматычны разрад (канкрэтны, зборны, асабовы, рэчыўны і інш.) прынцыпова ўплывае на напісанне канчаткаў назоўніка: напрыклад, у месным склоне *на вучню, аб аратару,* але *на кані, на пні, на трактары.* Асабовыя назоўнікі (якія ўказваюць на асобу) у такім выпадку маюць канчатак *-у, -ю,* а неасабовая — *-і, -ы.* Як відаць з ілюстрацый, выкарыстанне канчаткаў — з'ява граматычная.

«Праблемны» канчатак. Найбольшы клопат выклікае напісанне назоўнікаў другога скланення ў родным склоне. Трэба заўважыць, што канчатак выконвае, так бы мовіць, сэнсаадрознівальную функцыю: *да восьмага пад'езда* (дома) *і няма пад'езду* (да дома).

У роднай мове назіраецца тэндэнцыя да паступовага пашырэння ў такіх выпадках канчатка *-у*. У рускай мове прэвалюе канчатак *-а*. У ёй засталіся некаторыя распазнавальныя формы на *-а* і *-у*, аднак яны ўжо цяжка распазнаюцца, напрыклад: *чашка чаю* (частка ад цэлага) і *цена чая* (цэлае). Ва ўкраінскай мове дамінуе форма на *-у*. Як бачым, наша мова прынцыпова адрозніваецца ад сваіх суседак і ў гэтым пытанні, бо канчатак *-а* ці *-у* з'яўляецца ў назоўніках другога скланення ў залежнасці ад сэнсу: *няма пропуску заняткаў* і *няма пропуска* (дакумента), *сёмага лістапада* (назва месяца) і *няма ранняга лістападу* (ранняга ападзення лістоў з дрэў).

Займальныя гісторыі. У беларускай граматыцы да пэўнага часу існавала выключэнне, якое датычылася слоў так званага рэвалюцыйнага паходжання: назоўнікі другога скланення, якія пазначаюць грамадскія фармацыі, сацыяльна-палітычныя і навуковыя плыні, навуковыя тэорыі і інш., у родным склоне пішуцца з канчаткам *-у: капіталізму, феадалізму, матэрыялізму, дарвінізму, рэалізму, прагматызму, рэлятывізму, фаталізму, меркантылізму, фармалізму, футурызму, рамантызму, класіцызму* і інш. Выключэнне з гэтай групы слоў складаюць словы *камунізм, сацыялізм, марксізм, ленінізм,* якія па традыцыі ўжываюцца з канчаткам *-а (камунізма, сацыялізма, марксізма, ленінізма)*. З выключэння пайшлі гумарыстычныя гісторыі, якія распаўсюджваліся ў настаўніцкім і школьным асяродку. Напрыклад, дапытлівы вучань на ўроку разважае ўслых: «У родным склоне з канчаткам *-у* пішуцца словы, якія абазначаюць грамадскія фармацыі — *капіталізму,* але *сацыялізма, камунізма.* Значыць, гэта не грамадскія фармацыі! Назвы навуковых тэорый таксама пішуцца з канчаткам *-у — дарвінізму,* але *ленінізма.* Значыць, гэта не навуковая плынь!». Можна ўявіць рэакцыю настаўніка на «вывады» школьніка, асабліва ў тыя часы. Ці яшчэ. На перакананне вядомага вучонага пра тое, што абстрактныя назоўнікі павінны мець у родным склоне канчатак *-у* і сюды ж падпадае *ленінізм, марксізм,* ад партыйнага чыноўніка грымнула: «Вы што ленінізм лічыце нейкай абстракцыяй?!». Каментарыі тут лішнія...

Правапіс прыназоўнікаў. У «Правілах» (1959) не давалася дакладнага правіла аб напісанні прыназоўнікаў *аб, над, пад, перад* пры спалучэнні з формамі асабовага займенніка *я,* якія пачынаюцца збегам зычных. У новай рэдакцыі зафіксавана, што яны пішуцца з дадатковым *а: аба мне, нада мной, перада мной.* Прыназоўнік *з* замяняецца ў падобных выпадках на *са: са мной;* але: *з мяне.* Прыназоўнік *у* набывае форму *ва* ў спалучэннях са словамі з пачатковым *у: ва ўніверсітэце, ва ўрачыстасцях, ва ўрочышчы, ва ўкраінскай, ва ўнісон, ва Уроцлаве,* але *у вучылішчы, у амбары, у вогнішчы.*

Варыянт *са* прыназоўніка *з* згодна з вымаўленнем пішацца перад збегам зычных, калі першы з іх — шыпячы або свісцячы: *са школы, са шкіперам, са сваякамі, са смеху, са зброяй, са старых часоў, са сваімі сябрамі, са звонам, са здымка, велічынёй са шраціну, са знічкай;* але: *з братам, з праўдай, з пляча, з грукатам, з цвіком, адно з двух.* Апошнім часам гэтая рэкамендацыя не вытрымлівалася. Так, у некаторых дапаможніках можна знайсці: *прыйшоў за школы, размаўляў за мною, з школы, з зруба.* Апошнія дзве формы прымаліся і граматыкай Браніслава Тарашкевіча. Сучасная фармулёўка адпавядае традыцыі вымаўлення, пакладзенай яшчэ ў даўніну, калі існавалі рэдукаваныя. Гэтай жа старадаўняй уласцівасці падлягае і наступнае правіла: да прыставак *аб-, ад-, над-, пад-, раз- (рас-), с- (з-), уз- (ус-)* пры спалучэнні з марфемамі, якія пачынаюцца збегам зычных, далучаецца дадатковае *а: абарваць (абрываць), абагнаць (абганяць), адаспаць (адсыпацца), адапхнуць (адпіхваць), сабраць (збяру), сарваць (зрываць), надагнуць (надгінаць), падаспець, сатлелы, абамлець.* Дапускаецца напісанне ўстаўнога *а* для раздзялення двух губных гукаў: *абабягаць, абаперціся.*

Са спашукальнікам і з саіскальнікам. Прыстаўкі *су-* і *са-*. У новай рэдакцыі надаецца ўвага напісанню прыставак *са-, су-,* пра якія ў «Правілах» (1959) увогуле не гаварылася. Справа ў тым, што гэтыя шматзначныя прыстаўкі сталі актыўна пранікаць у маўленчую практыку. Паводле Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы (1977—1984), прыстаўка *су-* абазначае: сумеснасць, саўдзел *(суапякун, сумоўца);* сукупнасць, зборнасць *(сузор'е, суквецце);* суадноснасць пэўнай якасці паміж прадметамі *(сугучны, супамерны);* збліжэнне, супадзенне ў прасторы або часе *(суладны, сучасны);* указанне на ўнутранае адзінства чаго-небудзь *(суцэльны);* сумеснасць, суправаджэнне або ўстанаўленне суадносін паміж чымнебудзь *(сумясціць, суаднесці).* Прыстаўка *са-* таксама можа мець значэнне сумеснасці *(саўдзельнік),* таму напісанне абодвух прэфіксаў павінна было грунтавацца не толькі на семантычным прынцыпе.

Такім чынам, прыстаўка *су-* пішацца:

у назоўніках, дзе *су-* выдзяляецца толькі гістарычна: *сусед, сувой, сувязь, супын, супынак, сутаргі, сумятня, супастат, супоня, суткі, сутокі, суцяга, сумёт, сустаў;*

у новых утварэннях, калі ёсць слова і без *су-: суаўтар, суграмадзянін, супалімер, сукрэдытор, сукіраўнік, супастаўшчык, сучлен, суапякун, супрацоўнік, суродзіч, сунаймальнік, суспадчыннік, суадказчык, сузабудоўшчык, сувыканаўца* і інш.;

у словах, якія без *су-* не ўжываюцца: *суквецце, сузор'е, суладдзе, сугучча, суглінак, супесак, сукравіца, сузіральнік, суіскальнік, сумежжа, сухмарак.*

у дзеясловах: *суадносіць, супадпарадкоўваць, сумяшчаць, суіснаваць, сустракаць, сутыкацца, супярэчыць, супастаўляць, супадаць;*

у прыметніках: *сумежны, сукупны, суладны, сугучны, сучасны, сувымяральны, супольны, сумесны, суцэльны;*

у прыслоўях: *су□праць (супро□ць).*

Прыстаўка *су-* захоўваецца ў лексемах, словаўтваральна звязаных са словамі, што маюць прыстаўку *су-: сутачны (суткі), суцяжнічаць (суцяга), сурэдактарствацца (сурэдактар), суапякунства (суапякун), сузіранне (сузіраць), сумяшчальнік (сумяшчаць), сустрэчны (сустрэча), супярэчлівасць (супярэчлівы), сумежнасць (сумежны), супольнасць (супольны), сумесна (сумесны), насуперак (супраць)* і інш.

Прыстаўка *са-* пішацца:

у некаторых назоўніках, дзе прыстаўка выдзяляецца толькі гістарычна: *сасуд, савет, сабор, саюз, саслоўе;*

у запазычаннях і кальках (пераважна з рускай мовы): *саіскальнік, сакурснік, садружнасць, сатрапезнік, сачыненне, састаў, саслужывец* і інш.

Варта спыніцца на слове *саіскальнік*, якое пранікла ў родную мову з рускай. Напісанне яго падавалася слоўнікамі па-рознаму: і з прыстаўкай *са-*, і з прыстаўкай *су-*. У новай рэдакцыі правіл перавага аддаецца першай, аднак русізм усё часцей замяняецца словам *спашукальнік*.

Прыстаўка *са-* захоўваецца:

у лексемах, словаўтваральна звязаных са словамі з прыстаўкай *са-*: *саўдзел (саўдзельнік), саслоўны (саслоўе), састыкоўванне (састыкаваць), састаўляць (састаў), сашчэпка (сашчапіць)* і інш.;

у дзеясловах, калі *са-* з'яўляецца варыянтам *с-* (перад збегам зычных): *садраць (здзяру), сагнаць (зганю), саскочыць, сажмурыць, сапсець, сасмажыць, саслабець, сасватаць, састроіць, сашмаргнуць, сашпіліць, саштурхнуць, сасмягнуць, сагнуць, саграшыць, сашчыкнуць, сашчапіць* і інш.;

у прыметніку *сапраўдны* і вытворных ад яго.

Напісанне прыставак *су-* і *са-* ў іншых выпадках вызначаецца па слоўніку.

Заняткі дваццаць першыя.
ПРАВАПІС ПРЫСТАВАК НА *З-, С-*

Уводзіны. У роднай мове напісанне падвоеных (не падоўжаных!) зычных рэгламентавана асноўным правілам: яны могуць узнікаць толькі на стыку марфем. Гэта датычыць як уласнабеларускіх слоў, так і запазычаных. Нагадаем, што існуе толькі невялікая група слоў іншамоўнага паходжання, у якіх пішацца дзве аднолькавыя літары: *бонна, донна, манна, панна, ванна, мадонна, саванна; Ганна, Жанна, Сюзанна, Мекка* і інш. І калі задацца мэтай правільна напісаць па-беларуску агульнавядомы сказ, якім правяраюць веды рускай арфаграфіі, то для беларуса зрабіць гэта намнога прасцей. Сканструяваны ён спецыяльна, хаця хто-ніхто прыпісвае яго А. Чэхаву. Сказ мае шмат варыянтаў. Прывядзём адзін з іх: *На дощатой* ***террасе,*** *близ конопляника, небезызвестная вдова* ***коллежского асессора Агриппина Саввична*** *исподтишка потчевала* ***Фаддея Аполлоныча*** *сэкономленной ветчиной, винегретом и другими яствами под* ***аккомпанемент*** *виолончели.* Запісаць выдзеленыя словы па-беларуску лёгка, калі ведаць, што ў запазычаных словах, у тым ліку ва ўласных імёнах і назвах, і вытворных ад іх словах падвоеныя літары звычайна не пішуцца: *граматыка, група, калектыў, калекцыя, сума, карэспандэнт, каса, касір, тэрыторыя, піца, саміт; Ала, Васа, Генадзь, Іна, Нона, Іпаліт, Кірыл, Адэса, Калькута, Марока, Ніца.*

Калі параўнаць правапісныя зводы… У «Правілах» (1959) правапіс прыставак і суфіксаў часткова разглядаецца ў пятым раздзеле «Зычныя на стыку марфалагічных частак слова». Як ужо адзначалася, у новай рэдакцыі «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» гэтым пытанням прысвечана пятая глава «Правапіс некаторых марфем». Яе назва вымушана тым, што гаворка вядзецца пра марфемы, напісанне якіх часцей за ўсё выклікае пытанні: прыстаўкі і суфіксы. Хаця існуе пэўная колькасць іншых афіксаў: постфіксы, інтэрфіксы, конфіксы (цыркумфіксы), прэфіксоіды, суфіксоіды, уніфіксы, інфіксы і да т.п. Прыстаўка і суфікс — найбольш частыя ўтваральнікі новых слоў ці форм слова. Таму ім у правапісе надаецца асаблівая ўвага.

Стык прыстаўкі і кораня. Засталіся нязменнымі правілы напісання аднолькавых літар на стыку прыстаўкі і кораня: калі апошняя зычная літара прыстаўкі і першая літара кораня супадаюць, то пішуцца абедзве літары *(аддача, аддалены, Наддзвінне, наддаць, бяззорны, ззаду, ззелянелы, ссадзіць, ссівелы, бессардэчны, паддопытны, рассыпаць, раззлавацца, рассаднік* (тое, што з'яўляецца крыніцай чаго-небудзь), *уссаджваць)*. Сюды дададзены ілюстрацыі: *контрразведка, звышштатны, транссібірскі.*

Русізм *рассаднік* падаецца ў такім напісанні толькі ў пераносным значэнні: тое, што з'яўляецца крыніцай, школай, канцэнтрацыяй чаго-небудзь. Напрыклад, *Стыхійныя рынкі — невыкараняльны рассаднік хвароб і лёгкай нажывы* (з газет), але: *Расаднік кветак.* Сучасныя слоўнікі фіксуюць напісанне гэтага слова ў залежнасці ад значэння. У новай рэдакцыі з некаторым удакладненнем засталося старое выключэнне: у словах *расол, расольнік, расада, расаднік* (месца, скрынка для вырошчвання расады) адбылося сцяжэнне гукаў, і таму яны пішуцца з адной літарай *с*.

У словах-тэрмінах іншамоўнага паходжання часткова захоўваецца напісанне дзвюх аднолькавых літар на стыку марфем, асабліва тады, калі ёсць словы і без прыстаўкі, а прыстаўка далучаецца і да іншых каранёў: *сюррэалізм, аддукцыя (рэалізм, індукцыя)*. У «Правілах» (1959) у якасці адпаведных ілюстрацый дадаваліся словы *аннігіляцыя, іннервацыя*. У новай рэдакцыі яны аднесены да невытворных: у некаторых выпадках, калі слова ўспрымаецца як невытворнае ў беларускай мове, літары не падвойваюцца: *інавацыя, ірыгацыя, ірэальны, іміграцыя, акамадацыя, карэляцыя, аперцэпцыя, дысідэнт, імартэль,* ***анігіляцыя, інервацыя,*** *акорд, карэспандэнт.* Напісанне такіх слоў-тэрмінаў вызначаецца па слоўніку.

У новай рэдакцыі засталося ранейшае правіла напісання прыставак на *з-*, але зроблены некаторыя дапаўненні і ўдакладненні. Быў рэгламентаваны правапіс прыставак *дыз-* і *дэз-*. «Правіламі» (2008) прадпісваецца: да прыставак на *з-* адносяцца: *з-, із-, уз-, раз-, без-, небез-, абез-, праз-, цераз-*, а таксама *дыз-* і *дэз-*. У пэўных пазіцыях літара *з* замяняецца літарай *с*.

У прыстаўках з-, із-, уз-, раз-, без-, небез-, абез-, праз-, цераз- літара *з* пішацца перад звонкімі, санорнымі зычнымі і ётаванымі галоснымі (перад апострафам): *збіць, здаць, знесці, ізноў, узняць, узбіцца, розгалас, бязмежны, небеззаганны, небязгрэшны, абезгалосець, абязгрошыць, празмерны, цераззерніца; раз'есці, раз'езд, абяз'ёдаваны, з'інець, раз'юшаны, без'языкі, бяз'ядзерны, з'ялчэць, з'явішча, уз'юрыцца.* У слове разявіць і вытворных ад яго, а таксама ў словах *узлаваць* і *ўзлавацца* адбылося сцяжэнне [з] — прыстаўкі і [з] — кораня.

У гэтых жа прыстаўках замест літары *з* пішацца літара *с* перад глухімі зычнымі: *скінуць, схапіць, іспыты, усхваляць, раскідаць, роспіс, беспадстаўны, небескарысны, абяскровіць, абясшкодзіць, цераспалосіца, росшукі, росчырк.*

Калі корань слова пачынаецца з галосных *а, у, э* або ненаціскнога *і*, якое пераходзіць у *ы*, замест прыстаўкі *з-* пішацца прыстаўка *с-*: *сарганізаваць, сумысна, сэканоміць, сыграць;* але: *зымправізаваць, зыначыць.* Нягледзячы на тое, што гэтая норма была зафіксавана і ў «Правілах» (1959), словы тыпу *сэканоміць, сарганізаваць* мелі самае рознае напісанне:

з'эканоміць, зэканоміць, с'эканоміць і інш., што трэба лічыць няправільным. Як бачым, паводле новай рэдакцыі ў такой сітуацыі толькі два словы маюць прыстаўку *з-: зымправізаваць, зыначыць.*

У словах, утвораных ад дзеясловаў *ісці, хадзіць,* прыстаўкі на *з-* пішуцца ў залежнасці ад лексічнага значэння: *зысці — сысці, зысціся — сысціся, зыходзіць — сыходзіць, зыходзячы — сыходзячы, зыходны — сходны, сыходны, зыход — сход.* Напрыклад: *сышоў, сыходзіць, сыходзячы* (з ганку), але: *зыходзіць* (з меркавання), *зыходны* (пункт гледжання), *зыходны* (націск).

У новую рэдакцыю ўнесены дапаўненні: 1. У прыстаўцы *дыз-* перад галоснымі (у тым ліку ётаванымі) пішацца *з,* а перад зычнымі — *с: дызасацыяцыя, дызартрыя, дыз'юнкцыя, дысгармонія, дыспрапорцыя, дысквалiфікаваць, дысфункцыя, дыскрэдытаваць, дыскамфорт;* 2. Прыстаўка *дэз-* пішацца нязменна: *дэзактывацыя, дэзарыентацыя, дэзынфекцыя, дэзынтэграцыя, дэзурбанізацыя.*

Такім чынам, упарадкавана напісанне слоў з прыстаўкамі *дыз-* і *дыс-: дызасмія, дызурыя, дыз'юнкт* і *дысруптыўны, дысбаланс, дыслацыраваць, дысменарэя, дыспазіцыя, дысплэй, дыспрапорцыя, дыстрыбутый.*

Заўважым, што некаторыя слоўнікі фіксуюць у якасці самастойнай лексему *дэза.* Гэтае гутарковае ўтварэнне трэба лічыць своеасаблівым спрашчэннем слова *дэзынфармацыя.*

Актуальнае пытанне. У выпушчаным нядаўна «Беларускім арфаграфічным слоўніку» (Беларускі арфаграфічны слоўнік / Нац. акад. навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы, пад рэд. А.А. Лукашанца. Мінск: Беларуская навука, 2009. — 695 с.) на старонцы 238 падаюцца словы *зарыентавацца, зарыентаваць.*

У «Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі», зацверджаных Законам Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 г., у чацвёртым абзацы пункта 8 параграфа 28 «Прыстаўкі» прадпісваецца: ***калі корань слова пачынаецца з галосных а, у, э або ненаціскнога і, якое пераходзіць у ы, замест прыстаўкі з- пішацца прыстаўка с-:*** *сарганізаваць, сумысна, сэканоміць, сыграць; але: зымправізаваць, зыначыць.*

Правільна: *сарыентавацца, сарыентаваць.*

Заняткі дваццаць другія. ПРАВАПІС ПРЫСТАВАК НА СТЫКУ З КОРАНЕМ

Уводзіны. У «Правілах» (1959) правапіс прыставак пададзены ў раздзелах «Правапіс галосных», «Правапіс зычных», «Аб напісанні разам і праз злучок (дэфіс)», а таксама ў параграфах аб правапісе прыметнікаў, назоўнікаў і інш. Гэтаму можна знайсці тлумачэнне, таму што пры напісанні слова вельмі часта ўлічваецца якасць прыстаўкі: з якіх літар складаецца, на што заканчваецца, якога паходжання з'яўляецца і інш. Аднак такая раскіданасць цягнула за сабой нязручнасць ў пошуку адказу на пытанне, як напісаць тое ці іншае слова. Стваралася ўражанне, што ў гэтых раздзелах і параграфах можа разабрацца спецыяліст, які ўжо мае навыкі такога пошуку. А што было рабіць звычайнаму карыстальніку мовы?

Відаць, таму «Правілы» (1959) больш не перавыдаваліся, а знайшлі шырокае каментаванне ў рознага роду слоўніках, даведніках, падручніках і дапаможніках. Хаця патрэба ў перавыданні была верагоднай: нават дзеля таго, каб выправіць дапушчаныя хібы, накшталт такіх: «Папраўка. На стар. 53 §106 трэба чытаць: Пішуцца асобна», а не праз злучок, як ўказана ў тэксце.

У новай рэдакцыі правапіс прыставак максімальна сканцэнтраваны ў адным месцы. Як ужо адзначалася, гэтаму пысвечаны §22 «Прыстаўкі» главы пятай «Правапіс некаторых марфем».

Цяжкасці ў напісанні. Ёсць нямала выпадкаў, калі ўзнікаюць цяжкасці пры напісанні слоў, у якіх прыстаўка заканчваецца на *с-* або *з-,* а корань пачынаецца з шыпячага гука. Такі клопат выклікаюць паронімы *расчапіць* і *расшчапіць.* Сёння нават у падручніках, не гаворачы пра літаратурныя творы, знаходзім нераспазнаванне: *расчапленне* і *рашчапленне* выказніка (маецца на ўвазе перанясенне ў родную мову элементаў рускай кніжна-пісьмовай традыцыі: *аказаць дапамогу* замест *дапамагчы, аказаць садзеянне* замест *пасадзейнічаць, прымаць (браць) удзел* замест *удзельнічаць, стаць дабрэйшым* замест *падабрэць, стаць больш сталым* замест *пасталець* і шмат інш.), *расшчапіць* і *расчапіць* атам. Разнабой у напісанні зафіксаваны ў творах вядомых пісьменнікаў. Няправільна: «***...Расчапіў*** (трэба: расшчапіў) *сціснутыя губы, пазіраючы праз акуляры ў залу, загаварыў глуха, важка і цвёрда* (І. Мележ); *«Закаханых пачалі караць самаю страшнай карай, для чаго давялося выдумаць электрычнасць і* ***расчапіць*** (трэба: расшчапіць) *атам»* (В. Быкаў).

У «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» знаходзім: ***расчапіць*** *— раз'яднаць, адчапіўшы адно ад другога, развесці што-небудзь счэпленае* і ***рашчапіць*** *— 1. Раскалоць, раздзяліць на часткі. 2. Перастаць сціскаць; разняць, раз'яднаць; 3. Спец. Раздрабіць, прымусіць распасціся на часткі; 4. Спец. Раскласці на часткі пры дапамозе хімічнай рэакцыі; 5. Спец. Фізічным уздзеяннем прымусіць распасціся (атам)* (т. 4, 1980. — С. 700—701).

Перад намі паронімы (блізкія па напісанні і гучанні, але розныя па значэнні). Паводле «Слоўніка паронімаў беларускай мовы» С.М. Грабчыкава (Мн., 1994. — С. 318—319), словы адрозніваюцца: **Расчапіць.** *што.* Адчапіць адно ад другога, раз'яднаць счэпленае. *Замест таго каб расчапіць дрот каля калка, хлопец лёгка падняў веласіпед і пераставіў яго на другі бок загарадзі* (У. Дамашэвіч). **Расшчапіць.** *што.* 1. Раскалоць, раздзяліць на часткі. *У ежу яны ўжывалі чорную і горкую каменную соль, умелі расшчапіць запалку на чатыры часткі* (М. Арочка); 2. Перастаць сціскаць; разняць, раз'яднаць; п р о ц і л . сашчапіць. *Аксеня адсунулася ад замка і апусціла рукі. А потым працягнула адну з іх у бок Гаўруся і расшчапіла кулак. Ключ упаў на зямлю* (Я. Брыль); 3. *Спец.* Фізічным уздзеяннем прымусіць распасціся *(пра атам).*

Як бачым, правільнае арфаграфічнае адлюстраванне збегу прыстаўкі і кораня можа ўплываць на значэнне слова: расчапіць дрот, але расшчапіць атам.

Семантычная кандэнсацыя. У «Слоўніку беларускай безэквівалентнай лексікі» І. Шкрабы (Мн., 2008. — С. 246—247) фіксуюцца лексемы, якіх няма ў рускай мове, і перадача іх сэнсу рэалізуецца некалькімі словамі ў іншай мове: *Расчульвацца* — спачуваць, выказваць жаль, спагадаць: *Данік Малец, вясковы хлопчык, сірата, не дае чытачу расчульвацца над сірочаю доляй...* (У. Калеснік); *Расчытаць* — з цяжкасцю

разабраць напісанае: *Дзённікі Лобана — яшчэ ў рукапісах, якія ўжо нялёгка было расчытаць і самому аўтару* (В. Вітка).

У новай рэдакцыі прадпісваецца: спалучэнні літар *сч, сш, сшч, зж, здж* на стыку прыстаўкі і кораня перадаюцца нязменна: *расчахляць, расчэсваць, расчыніць, счысціць, счапіць, счэп, усчаць, счакацца, бесчалавечны, бясчулы, расчапіць (раз'яднаць), усчапіць (павесіць); расшыць, расшырэнне, сшытак, сшарэлы, расшумецца, расшпілены, бясшкодны, бясшлюбны; расшчапіць (раскалоць), расшчапленне (расколванне), расшчэп (раскол)* (не блытаць счапіць і шчапаць), *расшчаміць (разняць), расшчодрыцца, расшчоўкацца; зжыцца, разжаць, разжаліць, разжаніць, разжыва, безжурботна, безжыццёвы; здждаліць*. Выключэнні: *рашчыніць* (паставіць цеста), *ушчуваць, нішчымны*, а таксама вытворныя ад іх: *рошчына, ушчуванне, ушчунак, нішчымніца*.

Істотнае дапаўненне. У §22 новай рэдакцыі ў пункце 13 вядзецца размова пра тое, як прыстаўка можа ўплываць на напісанне каранёвага *і*. Пра гэта гаварылася і ў «Правілах» (1959), аднак новай рэдакцыяй уносіцца істотнае дапаўненне.

Пры спалучэнні прыставак *(аб-, ад-, над-, пад-, раз-, з- (с-), уз-, спад-, перад-,* ***дэз-, суб-)*** са словамі, што пачынаюцца з *і*, у адпаведнасці з вымаўленнем замест *і* пішацца *ы: абыграць, абынтэлігенціцца, зымправізаваць, зыначаны, зысці, сысці, адыграць, адыменны, адыходзіць, сыграцца, сышчык, узыход, спадылба, спадыспаду, перадынфарктны, падынтэграваць, разысціся, перадымперскі, перадыспытны,* ***субынспектар, дэзынтэгратар, дэзынфармацыя, дэзынфіцыраваць.*** Параўн.: паводле «Правіл» (1959): *дэзінтэграцыя, дэзінфармацыя, дэзінфекцыя, субінспектар*.

Унесены пэўныя карэктывы і ў наступную норму: пасля **прэфіксоідаў** *(звыш-, між-, пан-,* ***супер-,*** *транс-, контр-) і* захоўваецца: *звышімклівы, звышіндустрыяльны, звышінфляцыя, міжірыгацыйны, міжінстытуцкі, панісламізм, контрідэя, контрігра,* ***суперінтэлект,*** *трансіндыйскі*. Па-першае, тое, што раней лічылася прыстаўкамі, часцінкамі слоў названа прэфіксоідамі (элементамі слова, якія займаюць прамежкавае становішча паміж прыстаўкамі і самастойнымі словамі, параўн.: ***звыш*** *за,* ***між*** *алешын* і інш). Напрыклад, элемент *пан-* указвае на поўны ахоп з'явы, поўнае ўладаранне, перавага таго, што абазначаецца другой часткай: *панславянскі, панамерыканскі*. Па-другое, з параграфа «Правіл» (1959) «Галосныя *ы* і *і* пасля прыставак» выключаны прэфіксоід *суб-* і дадзены *супер-*.

У новай рэдакцыі ***захавана былая норма:*** у складанаскарочаных словах, першая частка якіх заканчваецца на цвёрды зычны, пачатковае і другога слова пішацца нязменна: *педінстытут, дзяржінспектар, палітінфармацыя, саніструктар, цяжіндустрыя, медінструменты, спецінструктаж, гарінспекцыя, гасінвентар*.

Зроблена ўдакладненне: прэфіксоід *экс-* пішацца праз злучок, і *і* не пераходзіць у *ы: экс-інжынер, экс-імператар*.

Некаторыя словы ***з коранем -ход- маюць варыянтныя формы:*** *адыходлівы — адходлівы, адыходнае — адходнае, адыходы — адходы, адыходнік — адходнік*.

Ад рэдакцыі часопіса «Пралеска».

Шаноўныя калегі! У бліжэйшых нумарах мы працягнем публікацыю матэрыялаў па новай рэдакцыі беларускага правапісу. Выпісвайце і чытайце часопіс «Пралеска».

НОВЫ АРФАГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

Калегі, тым часам, пакуль мы знаёмім вас з новай рэдакцыяй Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, выйшаў у свет «Беларускі арфаграфічны слоўнік».* Гэты слоўнік базіруецца менавіта на новых правілах, якія, нагадаем, уводзяцца ў дзеянне з 1 верасня 2010 года. Што і казаць, выданне атрымалася грунтоўным і надзвычай актуальным. Яго падрыхтавалі ў Інстытуце мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы Нацыянальнай акадэміі навук (НАН) Беларусі. Над слоўнікам рупіліся вядомыя даследчыкі беларускай мовы Л.П. Кунцэвіч і І.У. Кандраценя пад кіраўніцтвам дырэктара Інстытута, прафесара, член-карэспандэнта НАН, аднаго з аўтараў новай рэдакцыі Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі А.А. Лукашанца.

Слоўнік мае амаль 700 старонак адмысловага тэксту, уключае агульнаўжывальную лексіку, а таксама словы, якія могуць выклікаць цяжкасці ў напісанні. Адметна і тое, што сюды ўключаны і новыя лексічныя адзінкі сучаснай моўнай практыкі, але яшчэ не зафіксаваныя ў даведніках па беларускай мове (аўтабан, авакада, анімацыя, арт-дырэктар, арт-салон, аўтсайдар, байкер, відэакліп, відэаролік, вэб-дызайн, кансэнсус і інш.).

Структура слоўніка простая і дасціпная — увесь матэрыял размешчаны ў алфавітным парадку з указаннем націску, зыходныя словы выдзелены шрыфтам і даюцца ў сваёй зыходнай форме.

Новы «Беларускі арфаграфічны слоўнік», гэта падкрэслім асабліва, мае нарматыўны характар. Ён адрасаваны вучням сярэдніх школ, навучэнцам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, абітурыентам, настаўнікам беларускай мовы, перакладчыкам і студэнтам ВНУ, а таксама ўсім, хто карыстаецца пісьмовай беларускай мовай.

Зазначым таксама, што выпуск слоўніка ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь у Выдавецкім доме «Беларуская навука». Яго тыраж даволі вялікі — 5 тысяч экзэмпляраў, а кошт памяркоўны — крыху больш за 6 тысяч рублёў.

Слоўнік ужо ёсць у продажы і рэалізуецца па наяўным і безнаяўным разліку. Таму, шаноўныя калегі, раім набыць гэтае талковае і неабходнае ў нашай працы выданне. Яно, самі пераканаецеся, спатрэбіцца і дапаможа лепш і больш хутка авалодаць новай рэдакцыяй беларускага правапісу.

Алена МАЛІНОЎСКАЯ

* Беларускі арфаграфічны слоўнік / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. Л.П. Кунцэвіч, І.У. Кандраценя; пад рэд. А.А. Лукашанца. — Мінск: Беларуская навука, 2009. — 695 с.

Дзіна ДУБІНІНА,
дацэнт кафедры методык дашкольнай адукацыі БДПУ імя М. Танка,
кандыдат педагагічных навук

ПА РАБОЦЕ МАЙСТРА ЗНАЦЬ

КАЗКІ, ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ ЯК СРОДАК ЭТНАКУЛЬТУРНАГА ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ

У народнай педагогіцы ад бацькі і маці да сына і дачкі перадаюцца сакрэты майстэрства. Дзеці змалку прывучаюцца да карыснай справы, авалодваюць уменнем выконваць усялякую працу добра і хутка. Малыя ведаюць, што не тое дорага, что блішчыць нібы золата, а тое дорага, што зроблена добрым майстрам. Сёння ўжо мала вядома майстроў, якія самастойна, толькі рукамі і нескладанымі прыладамі працы вырабляюць карысныя і прыгожыя рэчы, але застаўся след працы людской. Рэчы, што зроблены народнымі майстрамі, захоўваюцца ў краязнаўчых музеях, іх можна сустрэць таксама і ў побыце вясковых жыхароў.

Прапануем вашай увазе канспекты серыі адукацыйных сітуацый «Па рабоце майстра знаць», якія накіраваны на азнаямленне дашкольнікаў з асаблівасцямі працы народных майстроў.

СЛЕД ПРАЦЫ ЛЮДСКОЙ

1. Чытанне ўрыўка з апавядання Васіля Віткі «След працы людской» і размова па змесце твора.

«...Не толькі імёны людскія ўве-кавечваліся ў памяці гарадоў і вёсак, а і справы, і рамёствы, і праца нашых продкаў, якою яны займаліся.

Болей за сотню налічыў я назваў, якія чутны на ўсёй Беларусі і паходзяць ад слова «руда»: Рудня, Рудніца, Руднае, Рудзенка, Рудавец, Рудаўка, Рудка, Рудзянец, Рудзенск, Рудаўляны, Рудзевічы, Руднікі... У далёкім мінулым усё гэта былі прамысловыя паселішчы, дзе з балотнай руды выплаўлялі жалеза. У нас каля паўсотні паселішчаў з назваю Гута, якая сведчыць аб даўнім развіцці ў Беларусі шкляных заводаў: Гутка, Гутніца, Гутава, Гута Замошская, Гута Ляшчынская, Новая Гута, Старая Гута, Студзёная Гута. Шкляныя вырабы гуты «Нёман», што на Гродзеншчыне, цяпер шырока вядомыя ў нас і за мяжою. Майстроў і рабочых, якія вырабляюць шкло, завуць гутнікі.

Паселішча Бандары, пэўна ж, выславілася некалі майстрамі, якія рабілі на патрэбу людзям добрыя бочкі, цэбры, дзежкі. У Бортніках не зводзіліся знаўцы, якія ведалі, дзе, у якіх лясах поўна ў дуплах дзікіх пчол. Паступова прывучалі іх насіць мёд у вулліборці, што рабілі з тоўстых калод і ставілі на дрэвах, каб мядзведзь не дастаў.

Сітнікі выраблялі сіты і рэшаты. Суднікі — драўляны посуд: лыжкі, міскі, каўшы, кадаўбцы.

Дойліды былі выдатнымі будаўнікамі».

2. Размова пасля чытання.

- Што акрамя людскіх імёнаў увекавечвалася ў назвах паселішчаў? *(У назвах паселішчаў увекавечваліся справы, рамёствы, сляды працы нашых продкаў.)*
- Як называлі паселішчы, дзе з балотнай руды выплаўлялі жалеза?
- Назвы якіх паселішчаў сведчаць пра даўняе развіццё на Беларусі шкляных заводаў?
- Якія паселішчы праславіліся некалі майстрамі, што рабілі на патрэбу людзям добрыя бочкі, цэбры, дзежкі?
- Што выраблялі ў паселішчах Сітнікі і Суднікі?
- Як называліся паселішчы, дзе жылі выдатныя будаўнікі?

3. Народная гульня «Работнікі».

Спачатку выбіраем вядучага — майстра.

Майстар становіцца ў сярэдзіну круга і гаворыць:

— Мы ўмелыя працаўнікі, аратыя і цесляры, сена косім, будуем дом... Што мы робім сякерай? — і паказвае на аднаго з удзельнікаў гульні, якому трэба адказаць на пытанне.

Пасля майстар называе другі інструмент і паказвае на іншага ўдзельніка, той называе дзеянне з гэтым інструментам (сякерай — сячом, касой — косім, рубанкам — стругаем, нажом — рэжам і г.д.).

4. Прыказкі і прымаўкі пра добрую працу.

Пра працу і таго, хто любіць працаваць, у народзе казалі:

Хто працуе, таму і... *шанцуе.*
Хто працуе, той... *святкуе.*
Добра рабі, добра і... *будзе.*

Дзеці дапаўняюць прыказкі.

АД СЛОВА «РУДА»

1. Размова з дзецьмі.

На Беларусі маецца многа назваў, якія паходзяць ад слова «руда». Гэта: Рудня, Рудніца, Руднае, Рудавец, Рудаўка, Рудка, Рудзянец, Рудзенск, Рудаўляны, Рудзевічы, Руднікі... У далёкім мінулым усё гэта былі прамысловыя паселішчы. *(Паводле Васіля Віткі.)*

- Што выраблялі ў гэтых паселішчах? *(З балотнай руды выплаўлялі жалеза.)*
- Якія вырабы з жалеза вы ведаеце? Назавіце іх, пакажыце на малюнках.
- Хто вырабляў з жалеза прыгожае аздабленне і гаспадарчыя прылады?

Рэчы гаспадарчага і дэкаратыўна-прыкладнога прызначэння з жалеза рабілі кавалі. Яны выкоўвалі сякеры, косы, нажы, нажніцы, цвікі, замкі, ключы, падкоўвалі коней. Кавалі выраблялі сельскагаспадарчы інвентар, прылады хатняга ўжытку, дэталі ўпрыгожвання жылля і мэблі. Пра працу каваля казалі, што «каваль куе, жалеза пяе», «у каваля рукі па локаць ў золаце». Рукі каваля параўноўваліся... з золатам *(тут і далей выхавальнік сваёй інтанацыяй запрашае дзетак да адказу)*. І сапраўды, прыгожыя вырабы з жалеза маглі зрабіць толькі рукі добрага... майстра.

2. Адгадванне загадак.

У народзе кажуць: «З голымі рукамі нічога не зробіш». Паспрабуйце адгадаць, пра якія гаспадарчыя прылады, зробленыя з жалеза, гаворыцца ў гэтых загадках.

Сам драўляны, а галава жалезная. *(Малаток.)*

Два канцы, два кальцы, а пасярэдзіне цвік. *(Нажніцы.)*

Без работы яна пацее і ржавее. *(Сякера.)*

Зубы вострыя мае, дробна жуе, а не глытае. *(Піла.)*

Цэлы дзень кланяецца, прыйдзе дамоў — расцягнецца. *(Сякера.)*

Маленькая, беленькая, увесь свет адзене. *(Іголка.)*

Бегла свінка, залатая спінка, ільняны хвосцік. *(Іголка з ніткай.)*

ПРА ГУТНІКАЎ

1. Размова выхавальніка з дзецьмі.

У нас каля паўсотні паселішчаў з назваю Гута. Гэта паселішчы: Гутка, Гутніца, Гутава, Гута Замошская, Гута Ляшчынская, Новая Гута, Старая Гута, Студзёная Гута. Яна ўтварылася ад слова «гутнікі». *(Паводле Васіля Віткі.)*

● А хто такія гутнікі? *(Майстры і рабочыя, якія вырабляюць шкло.)*

Дзе існуюць гэтыя паселішчы, там некалі былі шкляныя заводы. Некаторыя з гэтых заводаў існуюць і цяпер. Так, шкляныя вырабы гуты «Нёман» (г.Бярозаўка), што на Гродзеншчыне, цяпер шырока вядомыя ў нас і за мяжою. *(Паводле Васіля Віткі.)*

● Якія вырабы са шкла ёсць у вас дома? Назавіце іх.

● Усе гэтыя вырабы зроблены гутнікамі.

Шкляныя вырабы гутнікі выдзімаюць са шкла. Пад моцнай тэмпературай шкло становіцца вадкім. З дапамогай спецыяльнага прыстасавання з вадкага шкла выдзімаюць розныя прыгожыя вырабы.

2. Выдзіманне мыльных бурбалак.

Гутнікі выдзімалі прыгожыя вырабы з вадкага шкла. Мы таксама будзем разам з вамі выдзімаць, але не шкляныя вырабы, а мыльныя бурбалкі. Так, як мы з вамі выдзімаем мыльныя бурбалкі, гутнікі выдзімалі прыгожыя рэчы са шкла, якое таксама робіцца вадкім пры высокай тэмпературы.

3. Гульня «Шкляное — жалезнае».

Выхавальнік (В.). Я буду называць вам рэчы і кідаць мячык. Калі рэч шкляная, то вы ловіце мячык рукамі, а калі жалезная — не. *(Напрыклад: шклянка, малаток, бакал, каструля, чыгун, ваза, слоік, відэлец, лыжка, бутэлька і г.д.)*

4. Маляванне шкляных і жалезных вырабаў.

В. Падзяліце ліст паперы на дзве часткі. На адной намалюйце вырабы са шкла, а на другой — з жалеза. Раскажыце пра вырабы, якія вы намалявалі. Параўнайце іх паміж сабой.

БОНДАРЫ, БОРТНІКІ, СІТНІКІ, СУДНІКІ

1. Размова па тэме.

Паселішча Бандары, пэўна ж, выславілася некалі майстрамі, якія рабілі на патрэбу людзям добрыя бочкі, цэбры, дзежкі. *(Паводле Васіля Віткі.)*

● Хто такія бондары? *(Майстры, якія вырабляюць драўляныя рэчы — дзежкі, бочкі, посуд — для хатняй гаспадаркі.)*

● З якіх парод дрэў вырабляліся кадушкі, вёдры, конаўкі і іншыя рэчы?

— Цяпер гэтымі вырабамі часцей карыстаюцца на вёсцы, іх можна ўбачыць у краязнаўчых музеях.

Драўляны посуд для побытавых патрэбаў выраблялі з розных парод драўніны: з *дубу* — вёдры, кубельцы і дзежкі, бочкі і кадкі пад квас, сок, грыбы, агародніну; з *сасны* найчасцей выраблялі цэбры, балеі, кублы; з *асіны* — бочкі пад капусту.

Найлепшы драўляны матэрыял для вады і вадкіх рэчываў — *елка*. Яе драўніна вызначаецца цвёрдасцю і меншай успрымальнасцю да вільгаці.

У Бортніках не зводзіліся знаўцы, якія ведалі, дзе, у якіх лясах поўна ў дуплах дзікіх пчол. Паступова прывучалі іх насіць мёд у вуллі-борці, што рабілі з тоўстых калод і ставілі на дрэвах, каб мядзведзь не дастаў.

Сітнікі выраблялі сіты і рэшаты.

Суднікі — драўляны посуд: лыжкі, міскі, каўшы, кадаўбцы. *(Паводле Васіля Віткі.)*

(Тут і далей пры расказванні мэтазгодна паказаць малюнкі з выявамі названых вырабаў, а пры магчымасці — самі вырабы.)

2. Гульня «Хуткія вочы».

В. Я буду паказваць розныя вырабы, а вы называць іх. Хто першы правільна назаве, той атрымае фішку.

— А цяпер пагуляем інакш. Я буду паказваць малюнкі дрэваў, а вы будзеце паказваць і называць рэчы, якія з гэтага дрэва рабілі майстры.

3. Прыказкі аб працы.

В. Паслухайце прыказкі і прымаўкі аб працы:

Справа майстра... *баіцца.*

Дзе праца — там густа, а дзе лянота — там... *пуста.*

Не адкладвай на заўтра, што можна было зрабіць... *сёння.*

ПРАЦА ГАНЧАРОЎ

1. Размова па тэме.

Гаспадарчыя і дэкаратыўна-прыкладныя вырабы з гліны выконвалі ганчары. Посуд рабілі ў розных мясцовасцях, таму ён адрозніваўся сваёй формай і аздабленнем. Кераміка падзялялася на гартаваную, паліваную, чорназадымленую.

Гаршкі рабілі для гатавання гарачых страў. У іх варылі дзецям кашу. Два ці тры змацаваныя адной ручкай гаршкі называлі *спарышамі*, у іх насілі ежу ў поле.

Гарлачы прызначаліся для малака і малочных прадуктаў.

У *гляках* захоўвалі алей, квас, ваду.

З той жа мэтай, што і гарлачы, выкарыстоўваліся *збанкі*, але яны выдзяляліся выцягнутым тулавам, звужаным горлам, дзюбкай і вушкам-ручкай.

У *слоіках* захоўвалі мёд, тлушч, смятану, варэнне і іншыя прадукты. Бакі ў слоіках былі цукатыя, радзей прамыя, горла шырокае. Часам яны мелі адно ці два вушкі.

Макацёр уяўляў з сябе гліняную пасудзіну з шырокім вусцем, якая ў асноўным выкарыстоўвалася для расцірання прадуктаў, а таксама для гатавання ежы ў печы, заквашвання цеста.

Кубкі (конаўкі, кварты) прызначаліся для таго, каб піць з іх ваду. Яны мелі цыліндрычную ці бочкападобную форму і ручку.

Традыцыйным ганчарным вырабам былі *міскі*, якія ўяўлялі з

сябе глыбокую круглую пасудзіну для ежы.

2. Гульня «Падбяры пару».

В. У вас і ў мяне аднолькавыя карткі з выявамі ганчарных вырабаў. Я буду паказваць картку з выявай ганчарнага вырабу, а вам трэба знайсці такую ж, назваць выраб і паказаць яго.

3. Гульня «Гарлачыкі».

В. А цяпер пагуляем разам у «Гарлачыкі». Выберам маці, дачку і ката. Усе астатнія — гарлачыкі.

Маці пачынае гульню.

— Вось там будзе склеп. А вось тут — наша хата. Ідзіце, гарлачыкі, у хату!

Гарлачыкі прыйшлі ў хату і спыніліся.

Маці гаворыць:

— Дапамажы мне, дачушка, гарлачыкі ў склеп аднесці!

Маці і дачка бяруць па два дзіцяці за рукі і вядуць іх да склепа (г.зн. нясуць гарлачыкі). Так яны ходзяць, пакуль не перанясуць усе гарлачыкі ў склеп. Там гарлачыкі сядзяць на кукішках.

Маці звяртаецца да дачкі:

— Я пайду ў поле на работу, а ты вартуй гарлачыкі. Глядзі, каб кот у склеп не залез і гарлачыкі не перакуліў.

Маці адыходзіць, а дачка, крыху пачакаўшы, ідзе да сяброўак.

Выходзіць кот і азіраючыся па баках, уваходзіць у склеп і там абыходзіць гарлачыкі і гаворыць:

— Гэта смятанка! — І раз лапкай — перакульвае.

— Гэта сыроватка! — І раз лапкай — перакульвае.

— Гэта тваражок! — І раз лапкай — перакульвае...

У гэты час вяртаецца маці і заўважае перакуленыя гарлачыкі. Яна кліча дачку, і разам пачынаюць лавіць ката. Калі яны не могуць злавіць яго, то клічуць на дапамогу гарлачыкаў. Усе дзеці бяруцца за рукі і ловяць ката ў сетку. Кот лічыцца злоўленым, калі вакол яго ўдзельнікі гульні са-шчэпяць рукі.

4. Закончы прыказку.

В. Пра чалавека працы існуе шмат прыказак. Паслухай уважліва, закончы і растлумач, як ты разумееш іх сэнс:

Дзе няма ахвоты, там няма... *работы.*

Дзе шчырая праца — там густа, а дзе лянота — там... *пуста.*

Які рамеснік, такая і... *работа.*

Рамясло піць, есці не просіць, а само... *корміць.*

ПЛЕЦЕНЫЯ РЭЧЫ

1. Размова па тэме.

Плеценыя рэчы на Беларусі выраблялісь з лазы, саломы, чароту, каранёў дрэў, лыка, бяросты, лучыны.

З *лазы* рабілі мэблю — крэслы, калыскі, падстаўкі пад вазоны.

З *саломы* плялі шкатулкі, цацкі, сумкі, капелюшы.

З *сасновай лучыны* выраблялі посуд для таго, каб пакласці садавіну, агародніну.

Бяроста была добрым матэрыялам для пляцення кашалёў, сумак, вярэнек. Гэтыя ж вырабы плялі і з *рагозу*. Вярэньку выраблялі таксама з *лубу, лазы*. Яна ўяўляла з сябе плеценую каробку круглай, авальнай ці прадаўгаватай формы з адной ці дзвюма ручкамі і прызначалася для пераносу прадуктаў ці агародніны.

З *карэньчыкаў хваёвых дрэў* плялі карзінкі, фруктоўніцы. З *лыка* — лапці. Плеценымі рэчамі было зручна карыстацца, яны лёгкія і не разбіваліся.

2. Гульня «Падбяры матэрыял, з якога зроблена рэч».

Выберыце любую плеценую рэч, назавіце яе і матэрыял, з якога яна зроблена.

3. Гульня «Падбяры рэч да пэўнага матэрыялу».

Паглядзіце на гэтую саломку і знайдзіце ў групавым пакоі ўсе вырабы з яе, назавіце іх.

4. Прыказкі аб працы.

Працаваць не любіш — чалавекам не будзеш.

Праца чалавека корміць, а лянота порціць.

ТКАЦТВА

1. Размова па тэме.

Ткацтва было распаўсюджана на ўсёй Беларусі. Тканіну рабілі з нітак пянькі, лёну, воўны. Ткалі палатно, ручнікі, абрусы, посцілкі. Упрыгожвалі рэчы ўзорам.

Беларускія народныя ўзоры на тканінах вызначаліся прыгажосцю. Геаметрычны ўзор складаўся з шашачак, кругоў, квадратаў, прамавугольнікаў розных памераў. Яскравасць узору надавалі каляровыя ніткі.

Вышыванне і вязанне было адным з любімых заняткаў жанчын. Чырвона-чорныя вышытыя ўзоры на ручніках, кашулях, бялізне здзіўляюць сваёй прыгажосцю. Праца чалавека красіць і славіць.

2. Упрыгожванне ручнікоў, кашуль, спадніц.

Упрыгожце ўзорамі ручнікі, кашулі, спадніцы. Выкарыстоўвайце фарбы беларускага арнаменту.

3. Гульня «Фарбы».

В. Пагуляем у «Фарбы». Выберам гаспадара фарбаў і адгадчыка Яся. Усе астатнія будуць фарбамі.

Ясь адыходзіць убок, а гаспадар і фарбы ціхенька дамаўляюцца, хто будзе якой фарбай.

Гаспадар павінен добра запомніць, якой фарбай з'яўляецца кожны з дзяцей.

Калі колеры размеркаваны, фарбы і гаспадар прысаджваюцца на кукішкі і робяць выгляд, што засынаюць.

Тут прыходзіць Ясь. Падыходзіць, стукае некалькі разоў у дзверы і кажа:

— Тук-тук!

Гаспадар прачынаецца, устае і пытаецца:

— Хто там?

— Гэта Ясь!

— Чаго прыйшоў?

— Па фарбу!

— Па якую?

Ясь называе які-небудзь колер, напрыклад:

— Па сінюю!

Калі такога колеру сярод фарбаў няма, гаспадар кажа:

— Такой фарбы ў нас няма!

А ўсе фарбы пляскаюць у далоні і прыгаворваюць:

Пайдзі за сіненькі лясок,
Знойдзеш сіні чабаток,
Панасі, панасі
І нам прынясі.

Ясь адыходзіць убок, потым зноў вяртаецца і вядзе з гаспадаром ранейшую гутарку.

Калі фарба, якую просіць Ясь, ёсць, то ён адводзіць яе ў хату, а потым зноў вяртаецца да гаспадара па новую фарбу. Гульня заканчваецца, калі Ясь забярэ ад гаспадара ўсе фарбы.

Галіна ЦІТКОВА,
настаўніца музыкі I катэгорыі гімназіі № 11 г.Мінска

ВЯСНА, ПУСЦІ ХУТЧЭЙ ТРАВУ ШАЎКОВУЮ

СЦЭНАРЫЙ СУМЕСНАГА СВЯТА ДЛЯ БАЦЬКОЎ І ДЗЯЦЕЙ

Зала ўпрыгожана па-вясновому.

Гучаць спевы птушак, чуваць кукаванне зязюлі. У залу ўваходзяць 4 гурты дзяцей («Кветкі», «Вяснянкі», «Птушкі», «Звяры»), накіроўваюцца на свае ўзгоркі.

Дзяўчына і хлопец абвяшчаюць аб надыходзе Вясны.

Дзяўчынка. На нашай белай зямлі вясною звіняць капяжы, вятры галёкаюць. Над нашай ціхмянай і добрай зямлёю чуваць галасы продкаў. У песнях нашых і замовах!

Хлопчык. У снежную непагадзь гукнём Вясну, як некалі дзяды нашы гукалі!

Гурты з усіх узгоркаў звяртаюцца да ўдзельнікаў чатыры разы:

— Ці трэба нам Вясна-красна?
— Трэба, трэба!

Вяснянкі.
Вясна наша вясёлая — гу!..
Развесяліла зямлю,
ваду — гу!..

Птушкі.
Ой! Вясна,
Вясна вясёлая — у-у-у!
Нарасла трава зялёная — у-у-у!

Кветкі. Ды ўзвесяліла ўсе горачкі, даліначкі.

Вяснянкі. Дзе парабачкі — там дзевачкі — гу-у-у!

Птушкі. Ідуць парабачкі страляючы.

Звяры. А дзевачкі — спяваючы — гу-у-у!

Вяснянкі. Блаславі, Божа, на ўзгорачку сесці, Вясну загукаці!

Птушкі. Блаславі, Божа, зіму замыкаці, Вясну заклікаці!

Кветкі.
Дай, Божачка, на жытачка род,
На статачак плод,
Людзям на здароўе!

Усе гурты. Блаславі, Божа, Вясну-красну пеці! Гу-у-у-у-у!

Гурты перагукваюцца: першы — трэці, другі — чацвёрты.

Вяснянкі. Благаславіце, старыя людзі.

Птушкі. Ай, Вясну-красну загукаць.

Кветкі. Лютую зіму замыкаць.

Звяры. Вясну-красну — на вулачку!

Усе гурты. Лютую зіму — у каморачку!

Хлопчык. А ўжо на Саракі сорак выраяў птушак ляцяць да Беларусі. Звонка абвяшчае свята Жаваранак.

Кожны гурт стварае кола, раскідваючы хрэст-нахрэст ручнікі і падкідваючы ўгору спечаных жаўрукоў, спявае «Жавароначкі, прыляціце!». З'яўляецца Жаваранак.

Вяснянка. Ой ты, Жавароначак, ранняя птушачка, чаго так рана з выраю вылятаеш?

Жаваранак.
А там пры даліне —
ляжаць крыгі,
А там пры дарозе —
снягі і марозы.
А я тыя крыгі крыламі разаб'ю,
А я тыя марозы
нагамі растапчу.

Вяснянка.
Вясна, Вясна,
прынясі нам збожжа,
Прынясі нам красак,
каб звіць вяночак!

Гурты ствараюць адно вялікае кола вакол Вясны, спяваюць песню «Ой, Вясна».

Хлопчык. А потым агорне свет пяшчотай Вербная нядзеля!

Вясна і гурты спяваюць песню «Падай, Юр'ю». Гучыць урачысты голас трубы (запіс). З'яўляецца Юр'я. Вясна падае яму ключы.

Вясна.
Юр'я, вазьмі ключы залатыя,
Адамкні зямлю сырусеньку,
Пусці расу мядовую
на траву шаўковую,
На ўраджай, на ўсякі цвет,
На Белую Русь і на ўвесь свет!

Хлопчык. Слаўны наш Юр'я-Ярыла, дзе ж ты бываў?

Юр'я.
Я па полі хадзіў —
людзям жыта расіў,
Я па бору хадзіў —
людзям пчолы садзіў,
Я па хатах хадзіў —
людзям шчасце насіў!

Юр'я ўзнімае ўверх залатыя ключы. Вясна і Юр'я, адмыкаючы ключамі, абыходзяць кожны гурт. Гурты ўзнімаюць свае атрыбуты, ствараючы 2 колы: Вялізную Птушку, Вялізнае Сонейка, Вялікага Коніка, Пук Кветак.

Дзяўчынка. І выпадае блакітная раса на травы, як мара. Нясе жыватворную сілу Юр'я-Ярыла, каб дзеці і кветкі сусвету ўсміхаліся, каб зерне наша рупныя ўсходы дало.

Гучаць велічныя гукі трубы (запіс).

Вясна.
Ой, выйду, выйду я на вуліцу,
Да й гляну,
гляну ў чыстае поле!
А ў чыстым полі агонь гарыць!

Птушка.
Наш Юр'я агонь расклаў
Ды ўсіх да агню пазваў!

Юр'я.
Хадзіце ж, людцы, хадзіце ж,
мілыя, да агню!
Дзякуй Богу, Вясна прыйшла!

Вясна ўзмахвае вянком. Гурты ствараюць два колы. Юр'я ў сярэдзіну кола збірае Птушку, Коніка, Пук Кветак, Сонейка. Вясна вядзе ланцужок. Усе радуюцца і весяляцца.

Николай ВЕРАКСА,
доктор психологических наук

ДЕТСКИЙ САД ПО-ЯПОНСКИ

Японцы относятся к детям с особой любовью. Ещё в начале прошлого века российский учёный-японовед Г. Востоков подметил, что японцы воспитывают детей «с такою мягкостью и любовью, что не действует угнетающим образом на душу детей. Никакой ворчливости, никаких строгостей, почти полное отсутствие телесных наказаний; давление на детей оказывается в такой мягкой форме, что кажется, будто дети сами себя воспитывают и что Япония — детский рай, в котором нет даже запрещённых плодов...». Подобные принципы японцы стараются использовать и в современных дошкольных учреждениях.

На пути развития

ПЕРВЫЙ детский сад в Японии был открыт в 1876 году. Посещать его могли только дети обеспеченных родителей. В программу образовательной реформы дошкольное образование включили после Второй мировой войны. В 1947 году был принят закон об образовании, в рамках которого прописывалась деятельность детских садов (предназначенных в первую очередь для обучения детей), и закон о благополучии детей, на основании которого создавались центры по уходу за детьми (основная функция которых — уход за ребёнком). Детские сады и сейчас подчиняются Министерству образования, науки и культуры, в то время как центры по уходу за детьми — Министерству здравоохранения.

«Каждый ребёнок ценен сам по себе»

СОГЛАСНО закону об образовании 1956 года, обучение в детском саду разделялось на шесть основных направлений: здоровье, межличностные отношения, окружающая среда, язык, музыка (ритм), рисование (рукоделие). Данный закон содержал достаточно авторитарные формулировки — «дети должны», «нужно заставить детей понять» и др. В связи с развитием системы дошкольного образования в начале 1980-х годов был инициирован процесс пересмотра законодательства и эффективности работы детских садов. Результаты исследований, проведённых под руководством Министерства образования, науки и культуры, показали, что во многих садах вместо приятной атмосферы игры и побуждения любознательности детей педагоги придерживались учебного плана, ориентированного на конкретные цели. Кроме того, оказалось, что в некоторых детских садах детей обучали письму и счёту, что шло вразрез с основной идеей дошкольного образования (принятия детства как самоценного возрастного периода). Министерство образования, науки и культуры вынесло предупреждение таким садам о недопустимости учебного плана, ориентированного на освоение конкретных предметов и навыков. В результате в 1990 году был создан новый образовательный план. В нём акцент делался на том, что каждый ребёнок ценен сам по себе, вне зависимости от его характеристик и способностей. Вместо шести основных направлений осталось пять — здоровье, социальные отношения, окружающая среда, язык и выражение чувств.

В конце 1990-х в новых национальных стандартах дошкольного образования особое внимание было уделено созданию физической и психологической среды, которая должна способствовать пониманию ребёнком важности его связи с окружающими людьми. Сейчас во многих дошкольных учреждениях Японии существуют программы, направленные на привлечение взрослых к сотрудничеству с детским садом. Некоторые сады приглашают пап для того, чтобы те рассказывали о своей работе; другие принимают мам, которые проводят целый день с детьми. Такие встречи также помогают работникам садов создать наиболее подходящий учебный план, учитывающий особенности жизни ребёнка как в семье, так и в данном конкретном районе города.

Частный или государственный?

В НАСТОЯЩЕЕ время дошкольное образование в Японии не является обязательным. Так что в этой сфере встречается большее разнообразие и гибкость, чем на других образовательных уровнях. Детские сады и центры по уходу за ребёнком разделяются на государственные и частные. Около 80% детских садов и 60% таких центров принадлежат

частному сектору. По сравнению с частными в государственных образовательных учреждениях зарплата персонала выше, рабочий день существенно короче, а нагрузка меньше (благодаря укомплектованности штата). В частных детских садах из-за нехватки кадров нередко, чтобы снизить родительскую плату, количество детей в группе доходит до 40 человек, на которых приходится один педагог.

Образование для воспитателей

В ДЕТСКИХ садах и в центрах по уходу работают в основном женщины, многие из них (около 60%) моложе 30 лет. Представители сильного пола в большинстве случаев занимают руководящие посты — половина директоров детских садов — мужчины. Чтобы стать воспитателем детского сада, после окончания школы необходимо пройти двухгодичное (или четырёхгодичное) обучение, которое ориентировано на практические аспекты взаимоотношения с ребёнком. Значительное внимание в процессе обучения уделяется освоению методик занятий по рисованию, театру, труду, оригами, физической культуре, музыке и другим областям. В рамках обучения также преподаются курсы по детской психологии, физическому и умственному здоровью детей, питанию и социальным взаимоотношениям.

Воспитателем центра по уходу за ребёнком можно стать, лишь получив аттестат об окончании школы. Тем не менее, большинство воспитателей центров имеют неоконченное высшее образование, некоторые из них окончили курсы (программы), аналогичные тем, что являются обязательными для педагогов детских садов.

Как попасть в детский сад

РОДИТЕЛИ, которые хотят определить ребёнка в детский сад, обращаются в муниципальный офис. Чиновники рассматривают, попадает ли малыш в группу «нуждающихся в уходе детей» (к таковым, в первую очередь, относятся дети физически больных родителей, дети с одним родителем, дети из малообеспеченных семей и т.д.), и принимают решение. Если ребёнка берут в детский сад, то размер ежемесячного взноса за услуги будет зависеть от дохода семьи — чем он выше, тем выше и плата. В случае если ребёнка не берут в государственное дошкольное учреждение, родители обращаются в частные.

При этом чем меньше возраст ребёнка, тем дороже будет стоимость услуг. Некоторые частные детские сады обходятся дороже частных университетов. Однако в целом, благодаря тому, что частные сады получают дотации от государства, на практике они доступны большинству родителей. Например, центр по уходу за ребёнком (работающий в режиме 8-часового рабочего дня 5 дней в неделю) будет стоить среднеобеспеченным родителям четырёхлетнего малыша 130—150 долларов в месяц.

От центров по уходу за детьми до «детских отелей»

ЦЕНТРЫ по уходу за детьми принимают детей, начиная с 3 месяцев. Обычный режим работы центра — с 7 утра до 8 вечера. Правда, в последнее время стали популярны центры, которые предоставляют свои услуги в ночное время, а также «детские отели», работающие круглосуточно. В среднем центр принимает около 90 детей, на которых приходится более 25 сотрудников, работающих полный день, и более 10 сотрудников — неполный. Количество персонала зависит от возраста детей. Для детей первого года жизни соотношение педагогов к детям 1:3, для детей от года до трёх — 1:6, а для дошкольников старше 3 лет — 1:20. В детских садах детей принимают с 3 лет, хотя в последнее время в Министерстве образования, науки и культуры Японии обсуждается вопрос о том, чтобы позволить родителям отдавать в сад двухлеток.

Согласно статистическим данным, около 47% дошкольников от 3 до 5 лет посещают детские сады, 30% — центры ухода за ребёнком, а остальные остаются дома под присмотром близких. Если сравнивать посещение дошкольных учреждений японскими и европейскими детьми, то можно с уверенностью сказать, что первые гораздо в большей степени вовлечены в дошкольное образование.

Должны ли дошкольники учиться?

ВО МНОГИХ учебных планах дошкольных образовательных учреждений подчёркивается, что:

1. Каждый ребёнок должен понять, что он — один из многих, поэтому мнения других необходимо уважать.

2. Детям важно усвоить, что существует наиболее приемлемый способ выполнения различных дел, на освоение которого стоит потратить время и силы.

С европейской точки зрения сразу бросается в глаза отсутствие указания на формальную сторону обучения — нет и намёка на то, что ребёнок должен учиться считать или писать. Нужно сказать, что и на практике в детских садах не учат ни письму, ни счёту. Основная цель дошкольного учреждения — научить детей учиться, то есть сформировать способности, которые в дальнейшем (при поступлении в школу) позволят им овладеть необходимыми навыками.

Однако в последнее время часть педагогов начала отстаивать западную идею «когнитивно-ориентированного обучения», то есть как раз обучения конкретным знаниями и умениям. Данное направление критикуется многими японскими авторами за то, что его осуществление предполагает игнорирование указанных выше направлений работы, а в сфере когнитивного развития сводится лишь к счёту и письму, которые представляют небольшую часть познавательных способностей.

Скрипка Сузуки для одарённых

ОДНИМ из направлений работы в дошкольном образовании Японии является обучение одарённых детей. Однако одарённость понимается не как нечто единичное, уникальное, данное природой свыше, а как то, что можно взрастить во многих. Широко известен (как в Японии, так в США и Европе) метод обучения игре на скрипке Сузуки. Его можно сформулировать следующим образом — начинать обучение как можно раньше и заниматься как можно больше с хорошими педагогами. Как отмечал Сузуки, при соблюдении этих правил талант

будет доступен всем детям. Сам доктор Сузуки начинал учить игре на скрипке трёхлетних детей, и они добивались успеха.

Основные цели дошкольного образования сформулированы Министерством образования, науки и культуры Японии следующим образом:

1. Воспитание привычки к здоровой и счастливой жизни и укрепление здорового духа и тела.
2. Воспитание любви и доверия к людям, самостоятельности, умения сотрудничать и нравственности.
3. Воспитание интересов к окружающему миру и обществу.
4. Воспитание интереса к языку в повседневной жизни, желания говорить и слушать других для развития языкового чувства.
5. Воспитание творческого отношения к жизни за счёт разнообразного опыта.

«Возможность почувствовать себя членом группы»

В ИССЛЕДОВАНИИ Дж. Тобин взрослым задавался вопрос о том, что является главной целью обучения в детском саду. Более 80% опрошенных японцев ответили, что это «переживание эмпатии», в то время как в США подобный ответ встретился лишь в 39% случаев. Также более 60% взрослых в Японии отметили «возможность почувствовать себя членом группы». В сравнении с этим, например, в Китае и США, данный ответ не был столь популярен. Если говорить о социализации, то к окончанию дошкольного возраста в Японии от ребёнка ожидается, что он:

1. Ведёт себя как член группы.
2. Внимателен к нуждам членов группы.
3. Умеет слушать других.
4. Умеет отвечать на вопросы.
5. Умеет участвовать в групповых формах деятельности (в особенности в таких, как принятие пищи, уборка помещения и различные игры).

Особая практика образования

«ПРИ ВСТРЕЧЕ с японскими детьми в глаза бросается их уровень обученности, самостоятельность и уверенность в себе», — отмечала Дж. Уитберн. В 1995—1996 годах под её руководством было проведено сравнительное исследование, направленное на оценку достижений японских и английских детей 6—7 лет в области математики. В Англии к шести годам все дети уже на протяжении года посещали подготовительные к школе классы, и потому показали более высокие результаты, чем японские школьники. Однако через год оказалось, что японские дети значительно перегнали своих английских сверстников по осведомлённости в математике. Очевидно, что подобные результаты основываются на особой практике дошкольного образования. Основной акцент в дошкольном образовании в Японии делается как раз не на обучении детей тем или иным предметам, а на развитии навыков самостоятельного действия как члена группы.

Например, в классе каждый из учеников берёт на себя роль лидера («тобана»). Тобан помогает учителю раздавать материалы, необходимые для проведения занятий, следит за дисциплиной в классе, руководит обсуждением различных вопросов, несёт ответственность за чистоту помещения, сбор учащихся перед началом занятий и т.д. Поскольку каждый принимает на себя эту роль, то детям предоставляется возможность не только контролировать сверстников (что, безусловно, способствует развитию впоследствии самоконтроля), но и ощутить на себе результаты принятых коллективом решений.

«Будьте настойчивы в своих стараниях!»

ЧАСТО в детском саду можно услышать слова «Гамбате кудасай!», что означает «Пожалуйста, будьте настойчивы в своих стараниях!». Выполняя задания педагогов, дети усваивают очень важный принцип — мастерство достигается усилием. Именно усердие высоко ценится в японской культуре. При этом взрослые подчёркивают опять же групповую принадлежность ребёнка, что проявляется, например, в следующем правиле: если ребёнок закончил выполнение задания, то перед тем как сообщить об этом воспитателю, он должен убедиться, что и его сосед также справился с ним. Подобная ориентация на коллектив проявляется и в не связанных с обучением моментах. Например, в Токио, начиная с первых дней школьного обучения, дети добираются до школы в группах, которые возглавляет один взрослый.

Всю практику воспитания в дошкольном учреждении можно разделить на три части: мероприятия, связанные с выполнением установленных норм; свободная игра и деятельность; организуемая педагогом.

Выполняя установленные нормы

НАЛИЧИЕ норм и ритуалов необходимо, по мнению японцев, для создания безопасного, предсказуемого для ребёнка окружения. Каждый день известен заранее, что позволяет малышу постепенно обретать уверенность в себе, быстрее включаться в групповую деятельность. Дети знают, что от них ожидается и как необходимо себя вести. Например, когда малыши приходят в детский сад, то они должны повесить свою куртку на крючок, положить обувь в шкафчик, надеть сменную обувь, зайти и сесть в круг вместе с остальными детьми, в то время как педагог играет на фортепьяно. Когда все дети рассаживаются, каждый ребёнок (по кругу) приветствуется педагогом, что позволяет малышу почувствовать свою значимость и принадлежность к группе детского сада. Нужно сказать, что, например, в английских детских садах такая организация приветствия считается излишней и носит более неформальный характер. Одним из важных ритуалов в рамках дошкольного учреждения, также позволяющим ощутить ребёнку групповую принадлежность, является приём пищи. Дети достают свои циновки и вместе с воспитателями приступают к трапезе. При этом они объединены в группы по 5—6 человек.

Свободная игра

СВОБОДНАЯ игра заключается в том, что дети делают то, что хотят — рисуют, строят модели, участвуют в сюжетно-ролевых играх и т.д. Это позволяет установить более тесные контакты со сверстниками, столкнуться с конфликтами и самостоятельно их разрешить. Хочется подчеркнуть, что свободная игра в Японии свободна

от вмешательства взрослого. Если в США ребёнок, который столкнулся с агрессивным поведением, станет жаловаться воспитательнице и та будет разбираться в конфликтной ситуации, то воспитанник японского детского сада самостоятельно найдёт способ уладить конфликт. Основная роль здесь отводится группе и её давлению на обидчика. При этом, правда, японские педагоги всячески подчёркивают, что агрессивное поведение носит не умышленный характер, а является следствием непонимания. При этом решение конфликта всегда является для воспитателя поводом для похвалы ребёнка, который нашёл выход из ситуации.

В то же время в целом похвала и наказание в практике дошкольного учреждения являются не столь значимыми, как в европейских странах и США. Японские педагоги убеждены, что развитие самостоятельности возможно лишь в том случае, если малыш создаёт собственные ценности, что осуществимо только в свободной среде. Можно наблюдать, как в детском саду дети выходят из группы и ходят по коридорам, заходят в другие группы или направляются прямо к директору — дошкольник действительно может идти туда, куда он считает нужным. Педагоги не препятствуют такому перемещению — функция инструктирования возлагается на сверстников, и «одинокие путешественники» всегда знают, куда и когда нужно вернуться. В такой свободе выражается главная, по мнению японских педагогов и родителей, ценность дошкольного образования — сохранение детства в ребёнке. Дети принимаются такими, какие они есть — энергичными, любознательными, — и на основе такого принятия у малышей возникает уверенность и желание принадлежать к группе.

Выполняя задания педагогов, дети усваивают очень важный принцип — мастерство достигается усилием.

Вместе с педагогом

ОРГАНИЗУЕМАЯ педагогом деятельность также отличается от практики европейских и американских детских садов. Большая роль здесь отводится физической активности — играм с мячом, бегу, танцам и др., что в связи с возникшей проблемой лишнего веса у дошкольников актуально и в других странах. Любая деятельность, организуемая воспитателем, имеет чёткую цель: движение направлено на развитие координации; музыка — на развитие ритма, слуховой памяти и навыков счёта; рассказ — на обогащение словарного запаса и развитие языка. В то же время организованная педагогом деятельность всегда так или иначе связана с запросом, который исходит от ребёнка. Например, С. Тейлор в детском саду города Кавасаки увидела, как мальчики в коридоре пинали крышки от банок. Заметив это, многие дети стали искать крышки и подражать действиям ребят. Вместо того, чтобы пресечь подобное поведение, педагог предложила детям нарисовать крышки, обсудить различия между ними и придумать различные игры с крышками.

На пути к самостоятельности

В САДАХ также присутствует очевидная направленность на приобретение ребёнком реального опыта взаимодействия с миром. Так, например, в одном из токийских детских садов дети (начиная с пяти лет) регулярно самостоятельно создают постройки на открытом воздухе (домики для детской площадки, лодки и т.д.). С этой целью им раздаются строительные инструменты и материалы. Перед детьми ставится конкретная проблемная ситуация, и они с удовольствием приступают к её решению. В процессе строительства малыши понимают, что для покраски крыши дома нужно встать на стул, а для правильного крепления дощечки недостаточно одного гвоздя. На родительском собрании директор детского сада предупреждает родителей, что педагоги будут наблюдать за выполнением детьми этого проекта, но избежать травм, скорее всего, не удастся. Однако, по его мнению, для ребёнка важно научиться оценивать опасность при работе с инструментами, иначе он никогда не сможет относиться к ним подобающим образом. Представить эту картину в американском или европейском детском саду крайне сложно.

Бег и крик поощряются

НО БОЛЬШЕ всего удивляет общее отношение педагога к ребёнку. Как пишет Л. Пик, секрет профессионализма японских воспитателей заключается в том, что они умело используют социальные механизмы взаимодействия, терпеливо, но настойчиво обращаясь к ребёнку, не допуская проявлений власти, грубых слов или физических наказаний. Японцы считают, что главное в детском саду — сохранить детскую природу ребёнка. Поэтому, например, детей, которых по результатам психологической диагностики можно отнести к гиперактивным, японские педагоги считают энергичными и любознательными, но не проблемными, и относятся к их поведению с юмором и теплом. Вообще, шумные, подвижные дети в Японии вызывают меньше проблем, чем в других странах, поскольку в детском саду не предполагается, что малыши должны контролировать свой голос или поведение. Наоборот, бег и крик поощряются педагогами, поскольку являются, по их мнению, выражением силы (энергетической составляющей) характера ребёнка.

Нужен ли дошкольникам телевизор?

ГОВОРЯ о работе с детьми в японских детских садах, нельзя не упомянуть об использовании современных технологий в практике образования. В 1950 году была создана Национальная японская федерация учителей по изучению использования радио и телевидения в образовании, а к 1989 году более 70% детских садов использовали в своей работе телевизионные программы для малышей (начиная с 2-х лет). По данным Министерства образования, науки и культуры, в Токио дети, начиная с 3-х лет, смотрят телевизор в среднем около трёх часов в день. Данная статистика обернулась критикой применения телевидения в дошкольных учреждениях, поскольку дети «и так много времени проводят перед экраном». Кроме того, большинство педагогов ещё в начале 1990-х годов отмечали загрязнение языка как результат подражания телевизионной рекламе и различным программам. Также 70% воспитателей убеждены, что агрессивное поведение дошкольников является следствием просмотра соответствующих сцен насилия. Поэтому однозначного

мнения по применению телевизионных и компьютерных технологий в дошкольном образовании Японии на сегодняшний момент нет.

Семья и «хито»

ЯПОНСКИЕ родители, в отличие от европейских, стараются поддерживать тесную связь с ребёнком. Проявляется это в отношениях малыша и его матери. Что касается отцов, то, по данным исследований, по сравнению с американскими и немецкими японские папы меньше всего проводят времени со своими малышами. Японские матери достаточно долго носят малышей на спине, спят вместе с ними в кровати. Такая вседозволенность с западной точки зрения может рассматриваться как условие развития эгоистичности, в то время как в Японии состояние счастья у ребёнка рассматривается как наиболее значимое условие развития таких навыков, как сотрудничество, умение идти на компромисс, а также честность и откровенность (всё это в Японии обозначается одним словом — «сунао»).

Нужно сказать, что вообще слово «люди» («хито») применяется лишь по отношению к тем, кто не входит в данную семью. В Японии подчёркивается, что ребёнок не может вести себя с другими людьми так, как он ведёт себя дома. С семьёй малыш может быть жадным и эгоистичным, и это не будет чем-то неправильным, наоборот, такое поведение будет говорить о безусловном доверии ребёнка, ведь с родными он такой, каким он хочет быть. Подобная позиция японских родителей видна в следующем интервью:

— Чему, в первую очередь, должен научиться ребёнок?

— Не быть причиной неприятностей других людей. Не делать того, что отвернуло бы других людей от него.

— Когда вы говорите «людей», то имеете в виду кого?

— Людей вне семьи, конечно.

Предполагается, что если дома ребёнок может быть зависимым и безвольным, то в общении с другими он должен уметь дать отпор. Вот почему, приходя в детский сад, дети сталкиваются с тем, что их поведение должно серьёзно поменяться.

«Работай усердно!»

КОГДА в США мама провожает ребёнка в детский сад, то она желает ему хорошего дня, а когда забирает его, то обычно спрашивает о том, понравилось ли ему сегодня пребывание в саду. В Японии, когда мама отправляет ребёнка в сад, она говорит: «Работай усердно! У тебя всё получится!» Конечно, японские матери не ожидают, что их дети будут весь день работать, однако такие слова не могут не отразиться на отношении ребёнка к миру. В японской культуре усердие и старание ценятся больше, чем индивидуальные результаты в обучении.

Признание важной роли семьи в воспитании ребёнка во всех японских детских садах выражается в том, что педагог составляет ежедневные записи по каждому ребёнку, которые касаются его сна и питания. Эти записи передаются родителям, а утром родители передают свои записи о поведении ребёнка дома. В некоторых детских садах обязательным требованием является даже измерение родителями температуры ребёнка. Не нужно думать, что все японские родители с удовольствием рассказывают о тех проблемах, с которыми они сталкиваются дома.

70% воспитателей убеждены, что агрессивное поведение дошкольников является следствием просмотра по телевидению сцен насилия.

Избегание открытой конфронтации между родителями и педагогами является принципом, которому следуют обе стороны. Предполагается, что та или иная проблема в поведении ребёнка «всплывёт» в момент, когда родитель приводит или забирает ребёнка, или же когда он посетит детский сад в родительский день. Тем не менее, в записках педагога может быть обращение к родителям по поводу того, какое поведение ребёнка является желательным, а какое — нет. В любом случае понятно, что ежедневная необходимость наблюдения родителей за собственным малышом позволяет выстроить взаимодействие дошкольного учреждения и семьи, обеспечивая педагогов дополнительным механизмом социального контроля, а также заставляет самих родителей быть более внимательными к ребёнку.

Проблемы остаются

В ЗАКЛЮЧЕНИЕ отметим, что в настоящий момент японское дошкольное образование не лишено разногласий и противоречий. В качестве первой проблемы можно указать на несогласие большинства родителей и педагогов с усилением частного сектора в дошкольном образовании, поскольку это приводит к снижению качества образовательных программ. Второй проблемой является повышение роли академических успехов детей (несмотря на декларируемую социальную направленность дошкольного образования) — ряд престижных детских садов принимает лишь одного из пяти трёхлетних детей на основе конкурсного отбора. В результате в Японии появились учреждения, специализирующиеся на подготовке двухлетних детей к поступлению в детский сад.

Таким образом, мы видим, что в дошкольном образовании Японии есть тенденции, сходные с нашим образованием. Например, и в японских дошкольных учреждениях, и в наших педагог вынужден балансировать между необходимостью подготовки детей к школе и возможностью ребёнка полноценно проживать дошкольное детство. Вместе с тем, имеются и определённые отличия. Прежде всего, они касаются отношения педагогов к агрессивному поведению дошкольников. Особого внимания также заслуживает опыт работы воспитателей с родителями. Общая ориентация дошкольного образования на развитие рефлективности ребёнка, поддержку его инициативы, организацию стабильного окружения позволяет говорить о различии содержательных акцентов деятельности дошкольных работников, что может выступить в качестве основания для осмысления организации отечественного дошкольного образования.

В Японии состояние счастья у ребёнка рассматривается как наиболее значимое условие развития таких навыков, как сотрудничество, умение идти на компромисс, а также честность и откровенность.

Журнал «Современное дошкольное образование» (Россия).

Татьяна ПОЛИВКИНА,
главный инженер управления развития материально-технической базы Министерства образования Республики Беларусь

ОХРАНА ТРУДА — ВАЖНАЯ СОСТАВЛЯЮЩАЯ ДОЛЖНОСТНЫХ ИНСТРУКЦИЙ

Ряд наших читателей, работающих в дошкольных учреждениях, интересуются, какие вопросы охраны труда должны быть включены в должностные инструкции, и повлияло ли существенное изменение нормативной правовой базы, регулирующей трудовые отношения, произошедшее в нашей стране за последнее время, на содержание должностных инструкций.

1. ЧТО ПРЕДСТАВЛЯЕТ СОБОЙ ДОЛЖНОСТНАЯ ИНСТРУКЦИЯ?

Начиная этот разговор, не будет лишним напомнить читателям, что такое должностная инструкция, зачем, для кого и кто её разрабатывает.

